Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).
ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.
Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.
Невыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА. ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ. ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях ... АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

10 год выданьня. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 161 (2650) Чацьвер, 18-га ліпеня 1929 г.

Разрыў дыплёматычных зносін з Кітаем.

А другой гадзіне ўночы атрымана адказная нота Кітайскага ўраду разам з адказам на яе Народнага Камісарыяту Замежных Спраў.

У адказнай ноце Народнага Камісарыяту Замежных Спраў гаворыцца, што савецкі ўрад адклікае сваіх дыплёматычных і гандлёвых прадстаўнікоў, а таксама ўсіх савецкіх прадстаўнікоў на Кітайска-Ўсходняй чыгунцы, спыняе ўсякія чыгуначныя зносіны між Кітаем і СССР і прапануе ўсім кітайскім дыплёматычным прадстаўнікам у СССР зараз-жа пакінуць тэрыторыю Савецкага Саюзу.

Адначасова Савецкі ўрад заяўляе, што ён пакідае за сабой усе правы, якія выплываюць з Пекінскага і Мукдэнскага дагавораў 1924 году.

(Поўны тэкст кітайскай ноты і ноты на яе савецкага ўраду будзе зьмешчаны ў заўтрашнім нумары).

ЗА ЛЕНІНСКУЮ ЗЬМЕНУ.

Наша краіна—краіна сапраўднага сацыялістычнага будаўніцтва. Вялікі Кастрычнік выклікаў за сабой няўхільна рэвалюцыю ў экономіцы, культуры, у быце і зараз у краіне, на кожным нават самым няпрыкметным вучастку жыцьця адбываецца працэс рэвалюцыі—будаўніцтва новага, сацыялістычнага ладу, камуністычнага жыцьця. Камуністычны лад адну за другой адваёўвае пазіцыі ад старога, капіталістычнага, і нам, маладому пакаленьню Кастрычніка, усё больш і больш выразьней відны яскравыя мэты, да якіх вядзе працоўных наша партыя.

Працэс камуністычнай рэвалюцыі, камуністычнага будаўніцтва ня можа адбывацца без перавыхаваньня людзей, без працэсу фарміраваньня ў людзях камуністычнае псыхалёгіі, матэрыялістычнага сьветапогляду. Ад таго, як будзе адбывацца працэс фарміраваньня новых людзей, будзе залежыць затрыманьне і паскараньне і працэсу сацыялістычнага будаўніцтва. Гэта тым больш важна, што сацыялістычнае будаўніцтва адбываецца ў умовах напружаньня ўсіх сіл партыі, пралетарыяту і працоўнага сялянства над практычным ажыцьцяўленьнем пяцігадовага пляну разьвіцьця народнае гаспадаркі і культуры, ва ўмовах абвастрэньня клясавае барацьбы ў нашай краіне.

Сацыялістычны наступ пралетарыяту на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі выклікае супраціўленьне з іх боку і абвастрэньне клясавай барацьбы ня толькі ў галіне экономікі, палітыкі, культуры, а асабліва і ў галіне барацьбы за падрастаючыя пакаленьні, за ўплыў на іх. Нашы ворагі вельмі добра ўлічваюць значэньне таго, за кім пойдзе моладзь у прадстаячых бойках, за кім пайдуць падрастаючыя з дзяцей кадры моладзі, і робяць усё для ўзмацненьня свайго арганізацыйнага (сэктанты і інш.) ідэалёгічнага ўплыву на дзяцей.

Падрастаючыя пакаленьні павінны быць і будуць з Камуністычнай Рэвалюцыяй, яны павінны быць і будуць зьменай, вартай лепшых пралетарыяў нашай краіны, загінуўшых і згараючых у самааданай рэвалюцыйнай барацьбе за сацыялістычнае будаўніцтва.

Гэта вымагае ад камсамолу, ад партыі ўпартай працы па камуністычнаму выхаваньню дзяцей, вялізарнай увагі дзецям.

У нас ёсьць камуністычная арганізацыя, якая яднае дзяцей працоўных—піянэрская арганізацыя. Яна за годы свайго існаваньня ў Беларусі набыла агромністы вопыт працы з дзяцьмі. Не малую долю складае ў ім вопыт удзелу піянэрарганізацый у грамадзкай працы ўдзел у культпаходзе камсамолу, у перавыбарах с.-с., у камсамольскім паходзе за ўраджай і калектывізацыю, у барацьбе за новую сапраўды працоўную школу, якая (праца) выразьней за ўсё сьведчыць аб камуністычнай сутнасьці дзіцячага руху ў нас і якая сапраўды зьяўляецца адным з найлепшых мэтадаў камуністычнага выхаваньня дзяцей.

Але адданыя сацыялістычнаму будаўніцтву і барацьбе за яго Камуністычная партыя і пралетарыят нашай краіны вельмі мала аддаюць увагі справе падрыхтоўкі з дзяцей камуністычных рэзэрваў. Пытаньне камуністычнага выхаваньня дзяцей у практычнай працы не заваявала яшчэ належнай увагі партарганізацый, рабочай клясы, усёй савецкай грамадзкасьці, што значна адбіваецца на дзіцячым руху,—малая колькасьць, цякучасьць, нязначная матар'яльная база, адсутнасьць часта месца для збору. Належная ўвага павінна быць аддадзена піянэрарганізацыі. Перад намі важнейшая задача зараз—сабраць вопыт піянэрарганізацыі ў адно, сыстэматызаваць яго і ўважліва прааналізаваць. Дзеля гэтага праводзяцца зараз раёнавыя зьлёты піянэрарганізацый Беларусі, і ў жніўні адбудзецца Ўсебеларускі і Ўсесаюзны зьлёты. Але піянэрскія зьлёты павінны быць ня толькі аглядам растучых маладых рэзэрваў рэвалюцыі, вопыту іх працы, а і, галоўным чынам, аглядам таго, што зроблена партыяй, камсамолам, дзяржаўнымі і прафсаюзнымі арганізацыямі ў справе падрыхтоўкі гэтых кадраў і павінны даць у выніку патрэбны зрух у справе дапамогі камуністычнаму дзіцячаму руху, у справе падрыхтоўкі зьмены, бо зроблена намі ў гэтай справе зусім і зусім мала. У гэтым вялізарнае палітычнае значэньне зьлётаў. Таму ні ў якім разе нельга дапусьціць, каб раёнавыя і Ўсебеларускі зьлёты ператвараліся толькі ў парад-паказ дасягненьняў піянэрарганізацыі і ў агляд іх з боку савецкімі, прафэсыйнымі, партыйнымі і камсамольскімі арганізацыямі. Іменна таму, што мы любім дасягненьні піянэрарганізацыі, што яны нас радуюць, нам трэба прызнаць, як мала мы,—партыя, камсамол, уся савецкая грамадзкасьць—зрабілі для таго, каб гэтыя дасягненьні сталі ў шмат разоў большымі.

Часта, на жаль, у рабоце многіх арганізацый па дапамозе дзіцячаму руху ёсьць факты недаацэнкі ўсёй палітычнай значнасьці піянэрарганізацыі, факты абмежаваньня фармальнай дапамогі дзіцячаму руху, адлічэньнем устаноўленых „процантаў“, якія часамі складалі на ўвесь атрад пяцьдзесят кап. у месяц, факты, калі піянэратраду не даюць месца для збору. З такім становішчам трэба будзе скончыць.

Вынікам такога становішча зьявілася і тое, што ў асобных раёнах партыйныя і іншыя арганізацыі аднесьліся фармальна і да скліканьня раёных зьлётаў і не прыцягнулі ўвагі ўсіх членаў партыі, камсамолу, рабочых, і зьлёты, па сутнасьці, прайшлі толькі фармальна, ня даўшы патрэбных вынікаў; на зьлётах толькі былі самі піянэры ды камсамольцы, а іншыя арганізацыі абмяжоўваліся толькі прывітаньнямі на адчыненьні зьлёту. Гэта—трывожны сыгнал, які трэба ацаніць, як сьлед. Такіх фактаў можа быць больш. Ёсьць месцы, дзе падрыхтоўка да зьлёту ўскладзена цалкам толькі на штаб і па сутнасьці толькі на піянэрпрацаўнікоў, а іншыя арганізацыі, у тым ліку і камсамольскія камітэты, робяць зусім мала.

Падрыхтоўка і правядзеньне піянэрзьлётаў павінна стаць справай усёй савецкай грамадзкасьці, шырокіх колаў партыі, рабочае клясы.

Неабходна ўсямерна дапамагчы зьлётам маладых ленінцаў.

П. Галавач.

УРАД МАКДАНАЛЬДА ПРАВОДЗІЦЬ ПАЛІТЫКУ КАНСЭРВАТЫЎНАГА ГАБІНЭТУ.

Радавыя сябры рабочай партыі—супроць палітыкі ўраду.

ЛЁНДАН, 16-VII. На пасяджэньні парляманту ўрад Макданальда ізноў востра крытыкаваўся радавымі сябрамі рабочай партыі. Прычынаю для гэтай сутычкі была рэзалюцыя аб дапамозе на кватэрнае будаўніцтва, прапанаваная міністрам аховы здароўя Грынвудам. З вострай рэзалюцыяй выступіў Уітлі (міністр аховы здароўя ў першым урадзе Макданальда), які падкрэсьліваў, што габінэт Макданальда праводзіць у кватэрным пытаньні палітыку кансэрватыўнага габінэту. Уітлі, між іншым, сказаў: «Калі ўрад будзе і далей расчароўваць сваіх прыяцеляў палітыкаю паўзахадаў, дык ён страціць давер'е краіны“.

Рэзалюцыя Грынвуда была „прынята“ без галасаваньня. Востра крытыкавалі таксама праэкт Томаса аб „працы па разьвіцьці калёній“ і законапраэкт аб страхаваньні ад беспрацоўя, заяўляючы, што адносіны ўраду да гэткага спосабу сацыяльнага страхаваньня зьяўляюцца «абураюча несправядлівымі“.

Міралюбнасьць СССР—сапраўдная.

ЛЁНДАН. 16-7. Наконт савецкай ноты нанкінскаму ўраду лібэральная газэта «Манчэстэр Гардыян», між іншым, піша:

«Калі-б Макданальд зрабіў пасьля адчыненьня сэсіі парляманту паведамленьне, якога ўсе чакалі, аб тым, што англа-савецкія адносіны ўжо адноўлены, дык, магчыма, што кітайцы некалькі разоў падумалі-б раней, чымся адважыцца на такое выступленьне, якое можа паставіць пад пагрозу ўсеагульны мір.

СССР ня раз даказваў, што яго міралюбнасьць зьяўляецца сапраўднаю, а не паказнаю.

Савецкі ультыматум нават і зараз пакідае дзьверы адчыненымі для заміраньня, хоць нота і напісана моцнаю мовою».

ДАМО ПА ЛАПАХ КІТАЙСКІМ БАНДЫТАМ.

ПРАЛЕТАРЫЯТ У САЮЗЕ З СЯЛЯНСТВАМ—НЕПЕРАМОЖНЫ.

БУРНЫЯ ДЭМАНСТРАЦЫІ ПРАТЭСТУ Ў БЭРЛІНЕ

„САВЕЦКІ САЮЗ У НЕБЯСЬПЕЦЫ“.

БЭРЛІН, 17-VII. Учора ў Бэрліне адбыліся ў 10-ці раёнах масавыя дэманстрацыі пад лёзунгамі: „Савецкі Саюз у небясьпецы“, „дадзём актыўны адпор кожнаму імпэрыялістычнаму наскоку на бацькаўшчыну ўсяго сусьветнага пралетарыяту“. У дэманстрацыях узялі ўдзел дзесяткі тысяч рабочых. Выступаўшыя ў часе дэманстрацыі прамоўцы выкрывалі пляны імпэрыялістаў і іх кітайскіх агентаў, падкрэсьліваючы, што ў зьвязку з савецка-кітайскім канфліктам дэманстрацыі ў дзень 1-га жніўня набываюць асаблівае значэньне. Паліцыя ў некалькіх мясцох выступала проці дэманстрантаў, асабліва проці западозраных у прыналежнасьці да саюзу чырвоных франтавікоў. Арыштавана 25 дэманстрантаў.

Такія-ж дэманстрацыі адбыліся ва ўсіх буйных гарадох Нямеччыны. У Дусэльдорфе здарылася пры гэтым суровая сутычка між дэманстрантамі і паліцыяй; прычынаю сутычкі быў арышт некалькіх дэманстрантаў, якія належаць да забароненага саюзу чырвоных франтавікоў. Дэманстранты спрабавалі вызваліць арыштаваных. Паліцыя пусьціла ў ход гумовыя дубінкі і ўчыніла шмат новых арыштаў.

Закілзаць наёмных лёкаяў капіталу.

АРЦЁМАЎСК, 17-7. У зьвязку з наскокам кітайскай белагвардзейшчыны на Ўсходня-Кітайскую чыгунку адбыліся надзвычайна шматлюдныя мітынгі пратэсту рабочых і служачых заводаў і прадпрыёмстваў. Рабочыя пратэстуюць проці ганебных вылазак кітайскіх бандытаў і катэгарычна патрабуюць ад савецкага ўраду ўжыць рашучыя захады, каб закілзаць наёмных лёкаяў капіталу. Рабочыя патрабуюць ад ураду паскорыць выпуск 3-й пазыкі і абяцаюць ужыць усе захады да яе разьмеркаваньня.

ПРАЛЕТАРЫЯТУ Ў САЮЗЕ З СЯЛЯНСТВАМ ПЕРАМАГЧЫ НЕЛЬГА.

ЛУГАНСК, 17-VII. Агульны сход сялян Слаўска-Сербску ў адказ на падзеі на Ўсходня-Кітайскай чыгунцы заяўляе, што ўсе, як адзін, паўстануць на абарону заваёў Кастрычніка і дакажуць, што пралетарыяту ў саюзе з сялянствам перамагчы нельга.

* *
*

Шматтысячная дэманстрацыя адбылася сёньня ў Ленінградзе. Выступаўшыя рабочыя пад бурныя воплескі заявілі: „Ленінградзкі пралетарыят здолее са зброяй у руках абараніць заваёвы Кастрычніка. Бурнымі авацыямі спатканы выступленьні чырвонаармейцаў, якія заявілі, што Чырвоная армія непарушна стаіць на варце СССР і гатова даць адпор ворагу.

У ЗНАК ПРАТЭСТУ БЭРЛІНСКІ ПРАЛЕТАРЫЯТ ПАВЫБІВАЎ ШЫБЫ У КІТАЙСКІМ КОНСУЛЬСТВЕ.

БЭРЛІН, 16-VII. Як паведамляе „Ротэ Фанэ“, учора ўвечары перад памяшканьнем кітайскага консульства ў Бэрліне адбылася дэманстрацыя пратэсту бэрлінскіх рабочых проці правакацыйнага выступленьня кітайскай улады на Ўсходня-Кітайскай чыгунцы. Пасьля выгукаў абурэньня дзевяньнямі кітайскага ўраду ва ўсе шыбы консульства паляцелі каменьні. Шыбы паразьбіваліся на дробныя кавалачкі. Дэманстрацыя скончылася да прыходу паліцэйскага атраду, высланага для аховы консульства.

КІТАЙСКІЯ БАНДЫТЫ ПРАСЧЫТАЛІСЯ.

ШАНХАЙ, 16-7. Шанхайскія чужаземныя газэты зьмяшчаюць вельмі падрабязна водгукі друку ўсяго сьвету на савецка-кітайскі канфлікт. Тлумачэньні ўсіх чужаземных газэт яўна ня спрыяюць пазіцыі нацыянальнага ўраду. Гэта зрабіла тут вялікае ўражаньне, асабліва сярод кітайцаў, якія думалі, што пад лёзунгам барацьбы з камунізмам можна рабіць розныя ганебныя ўчынкі без канца. Кітайскі друк па цэнзурных умовах зьмяшчае яўна інсьпіраваныя тэлеграмы з Нанкіну і Пэйпіну. Аднак, у асьвядомленых кітайскіх колах гэтым паведамленьням не надаюць ніякага значэньня.

Кітайскія рабочыя выступяць у абарону СССР.

Ва Ўладывастоку стыхійная дэманстрацыя пратэсту сабрала дзесяткі тысяч рабочых і служачых. У дэманстрацыях узялі ўдзел 2 тысячы кітайскіх грузчыкаў. Каля памяшканьня кітайскага консульства дэманстранты наладзілі кашачы канцэрт.

2 тысячы прадстаўнікоў кітайскіх рабочых зьявіліся на Іванава-Вазьнясенскі абласны зьезд саветаў і заявілі: „13 тысяч рабочых, якія паслалі нас, гатовы на першы заклік савецкай улады ўзяць вінтоўкі і даць буржуазіі адпор“. Для далейшага ўзмацненьня СССР рабочыя патрабуюць выпуску 3-й пазыкі індустрыялізацыі.

ЗГРУПАВАНЬНЕ КІТАЙСКАГА ВОЙСКА КАЛЯ СТАНЦЫІ МАНЧЖУРЫЯ І ТЭЙ-ХО.

ПЭЙПІН, 16-7. Згодна паведамленьняў з Нанкіну, адказ на савецкую ноту магчымы заўтра, калі Ван-Чжэ-Цін вернецца ў Нанкін.

Згодна агульнай думкі, якая пануе ў Пэйпіне, нанкінскі ўрад выкажа гатоўнасьць распачаць перамовы, ухіляючыся абвастрыць канфлікт.

Водлуг вестак з японскіх крыніц, зараз адбываецца нясупыннае перасоўваньне і згрупоўваньне кітайскага войска каля станцыі Манчжурыя і прымежнай станцыі Тэй-Хо.

ВЕРНЫЯ СЛУЖКІ ІМПЭРЫЯЛІСТАЎ.

Нагляд на Ўсходня-Кітайскую чыгунку арганізаваны імпэрыялістамі з мэтай справакаваць СССР на вайну (з газэт).

Клясавая барацьба абвастраецца.

20-тысячная дэманстрацыя рабочых.

БЭРЛІН, 15-7. Адбыўся 3-ці «дзень салідарнасьці бэрлінскага пралетарыяту з Міжрабпомам». У дэманстрацыі салідарнасьці і на ўрачыстым вечары ўдзельнічала блізка 20.000 чалавек. Дэманстрацыя і мітынг прайшлі пад лёзунгамі: «Вайна імпэрыялістычнай вайне“, «Прэч роспуск саюзу Чырвоных франтавікоў», „На абарону СССР“ і г. д.

Сярод запасных салдат—хваляваньні.

ПАРЫЖ, 13-7. Водлуг паведамленьня „Юманітэ, у лягэры Рушар, дзе разьмеркаваны 32-гі пяхотны полк, гэтымі днямі здарыліся сур'ёзныя непакоі сярод запасных салдат, якія адмовіліся выйсьці на вучэньне, патрабуючы вызваленьня таварыша, які крытыкаваў рэжым у лягеры. Хваляваньні супакоіліся толькі пасьля вызваленьня арыштаванага.

Забарона выхаду камуністычнай прэсы.

ПРАГА, 15-7. Цэнтральны орган чэхаславацкай кампартыі „Рудэ Права“, яго вячэрняе выданьне, а таксама орган Броунскай арганізацыі партыі забаронены на адзін месяц на падставе закону аб абароне рэспублікі.

Забастоўка салідарнасьці партовых рабочых.

У САНДАСЕ, РОЗАРЫЁ І БУЭНОС-АЙРЭСЕ ЖЫЦЬЦЁ ЗАМЁРЛА.

НЬЮ-ЁРК, 16-7. Партовыя рабочыя ў Буэнос-Айрэсе (сталіца Аргентыны) абвясьцілі 48-мігадзінную забастоўку салідарнасьці з бастуючымі партовымі рабочымі ў Розарыё і Сандасе. Жыцьцё ў партох Сандасе, Розарыё і Буэнос-Айрэсе нібы замёрла.

Ангельская фэдэрацыя прафсаюзаў, якая кіруе забастоўкаю, пагражае ўсеагульнаю забастоўкаю ў выпадку спроб ураду аднавіць рух у партох. Забастоўка партовых рабочых у Розарыё распачалася тыдзень назад. Бастуючыя патрабуюць прымаць на працу толькі сяброў саюзу.

Катаржныя прыгаворы маладым рабочым.

ВЕНА, 15-VII. У Бухарэсьце скончыўся працэс 5-ці маладых рабочых па абвінавачаньні ў распаўсюджаньні першамайскіх лятучак. Галоўны абвінавачаны, ранейшы рэдактар юнацкага органу „Тавэруя Луптатар“ Іён Папэску засуджан завочна на 6 гадоў зьняволеньня.

Прысутныя на судзе абвінавачаныя Рычард Вурмбанд і Ірмэ Харват засуджаны на 3 гады зьняволеньня кожны, а Алена Бэла і Слойн Любатору—на 2 гады зьняволеньня кожны. Засуджаныя спаткалі прысуд выгукамі: „Няхай жыве сусьветны камсамол, няхай жыве Камінтэрн“.

С.-д. лёкаі зрываюць барацьбу пралетарыяту

БЭРЛІН, 13-VII. Сацыял-дэмакратычны міністр працы Вісэль абвясьціў сёньня абавязковую пастанову трацейскага суду па камфлікце ў тэкстыльнай прамысловасьці. Пастанова трацейскага суду прадаўжвае тэрмін сучаснага калектыўнага ўгавору да 1-га жніўня 1931 году бяз ніякіх зьмен. Барацьба 50.000 тэкстыльшчыкаў адбывалася на працягу 2 тыдняў. Рэвалюцыйная прафэсыянальная меншасьць патрабавала павялічэньня заработку.

Паход нямецкай буржуазеі супроць кампартыі

БЭРЛІН. У Лейпцыгу скончыўся працэс па абвінавачаньні ў дзяржаўнай здрадзе рабочага Кнітэра і ўласьнікаў друкарні братоў Рэнэр. У выніку выявілася, што працэс накіраваны ня гэтулькі проці абвінавачаных, як проці кампартыі Нямеччыны, бо абвінавачаньне было абгрунтавана вынятkамі з тэзісаў 6-га сусьветнага кангрэсу Камінтэрну і з рэзалюцый зьезду кампартыі Нямеччыны. Браты Рэнэр засуджаны на 9 месяцаў зьняволеньня ў крэпасьці і на 100 марак штрафу кожны. Кнітэр—засуджан на 2 гады зьняволеньня ў крэпасьці.

ПРАЛЕТАРЫЯТ РЫХТУЕЦЦА ДА 1 ЖНІЎНЯ

Буржуазея дрыжыць перад 1 жніўня.

ПРАГА, 16-VII. Чэхаславацкае тэлеграфнае агенцтва паведамляе: „У Лявіё (каля Прагі) урадавымі органамі забаронены ўсе публічныя маніфэстацыі на тэрмін з 27-га ліпеня да 8-га жніўня“.

Першажнівеньскія камітэты—супроць вайны.

ПАРЫЖ, 13-VII. Камітэт парыскае арганізацыі французкае камуністычнае партыі агаласіў адозву, якая заклікае фабрычна-заводзкіх і сельска-гаспадарчых рабочых, салдат і рэфарыстаў узяць удзел у зьезьдзе рабочых і сялян, які адбудзецца 21-га ліпеня ў Клішы (ваколіца Парыжу).

Адозва заклікае ўсе рэвалюцыйныя арганізацыі працоўных мас засноўваць усюды 1-шажнівеньскія камітэты барацьбы, падрыхтаваць дэманстрацыі да міжнароднага чырвонага дню, ажыцьцявіць тыдзень рабочае клясы і падтрымаць барацьбу салдат.

Пралетарыят Парыжу дае адпор паліцыі і жандармэрыі.

ПАРЫЖ, 16-7. 140-я ўгодкі захопу Бастыліі 14-га ліпеня адзначаны ў Парыжы і ваколіцах шматлікімі сутычкамі між паліцыяй і рабочымі масамі, якія наладзілі маніфэстацыю проці выкарыстаньня ўгодак дзеля шавіністычных мэтаў. У рабочых ваколіцах рабочыя рэагавалі на патрыятычныя выступленьні, заглушаючы іх сьпевам „Інтэрнацыяналу“ і выгукамі „прэч імпэрыялістычную вайну“, „няхай жыве амністыя“.

У Монтэры тысячы рабочых накіраваліся ў двор гарадзкой ратушы са сьпевам „Інтэрнацыяналу“. З прычыны таго, што паліцыі не ўдалося разагнаць маніфэстацыі, была выклікана жандармэрыя. У розных раёнах Парыжу паліцыя арыштоўвала прадаўцоў камсамольскага органу „Авангард“. Рабочыя масы ўсюды спрабавалі перашкодзіць арыштам.

Значныя сутычкі здарыліся наваокол Бастыліі, дзе згодна паведамленьня камуністычнае „Юманітэ“, пасьля арышту прадаўцоў газэт і грубых абыходзін з боку паліцэйскіх, натоўп зьбіў 3-х паліцэйскіх. За ўвесь дзень у Парыжы арыштавана больш за 30 чалавек. Адначасна ўрад узмацніў рэпрэсіі проці рабочых арганізацый і рабочага друку. Учора раніцою арыштаваны ў сваёй кватэры адказны рэдактар камуністычнае часопісі „Інтэрнацыянал“ камуніст Калзан, абвінавачаны ў заклiку салдат не падначальвацца.

Гельсінгфорскі пралетарыят рыхтуецца да 1-га жніўня.

ГЕЛЬСІНГФОРС, 15-VIII. У Выбарскай газэце „Сі'ё“ агалошана адозва гельсінгфорскага рабочага камітэту па падрыхтоўцы да міжнароднага чырвонага дню 1-га жніўня. Адозва заклікае наладжваць дэманстрацыі і сходы ў гэты дзень.

„КРЫЛЬЯ СОВЕТОВ“ У ПАРЫЖЫ.

Разьвітаньне ў Бэрліне было вельмі шчырым.

БЭРЛІН, 16-7. Савецкі самалёт «Крылья Советов» вылецеў а 13 гадз. 30 хвілін з Бэрліну ў Парыж.

Перад вылетам на аэрадроме Кентненгофэ сабраліся шматлікія прадстаўнікі нямецкіх урадавых устаноў лётных арганізацый, друку і савецкіх калёній на чале з паўнамоцным прадстаўніком Красьцінскім.

Разьвітаньне было вельмі шчырым, асабліва з Громавым, які ў часе свайго пабыту ў Бэрліне літаральна ня меў праходу ад прадстаўнікоў друку, якія жадалі атрымаць ад яго інтэрв'ю. На аэрадроме прысутнічала шмат народу, асабліва рабочых, якія сьпявалі рэвалюцыйныя сьпевы.

Адлятаўшым была наладжана бурная авацыя.

Аэрадром абкружан моцным атрадам паліцыі.

ПАРЫЖ, 16-7. Самалёт „Крылья Советов“ зьнізіўся 16 ліпеня а 18 гадз. 45 хвілін на аэрадроме пакрыўшы 960 кілёмэтраў за 5 гадзін 15 хвілін.

Самалёт спаткан толькі прадстаўнікамі парыскага паўнамоцнага прадстаўніцтва СССР, гандлёвага прадстаўніцтва і «Люфт Ганза».

На аэрадроме быў пастаўлен узмоцнены нарад паліцыі і ўвесь багаж самалёту быў уважліва перагледжан.

У САЮЗНЫХ РЭСПУБЛІКАХ

Забясьпечыць выкананьне вытворчай праграмы

МАСКВА, 15-7. Савет Працы і Абароны абавязаў ВСНГ СССР ліквідаваць недагрузы ўборачных машын, а таксама максымальна павялічыць выпуск гэтых машын да надыходзячай уборачнай кампаніі.

ВСНГ СССР павінен забясьпечыць поўнае выкананьне вытворчай праграмы сельска-гаспадарчага будаўніцтва зацьверджанай на 1928-29 год, а таксама забясьпечыць выкананьне тэрмінаў здачы прадукцыі машыназабясьпечваючым арганізацыям.

1.100 батракоў-камуністаў у сельска-гасп. ВНУ

Масква. ЦК УсеКП(б) мабілізуе ў сельска-гаспадарчыя ВНУ на 1929-30 год 1100 камуністаў, у тым ліку 10 проц. жанчын.

Аднача сна ЦК прапануе мабілізаваць 200 сяброў і кандыдатаў партыі з батракоў і сельска-гаспадарчых рабочых для пунктаў НК Асьветы па падрыхтоўцы батракоў у с.-г. ВНУ, забясьпечыўшы ў складзе мабілізаваных ня менш, як 20 проц. батрачак і с.-г. работніц.

ЦК зацьвердзіў разьвёрстку на 120 сяброў і кандыдатаў партыі на курсы НК Асьветы для кіруючых адміністрацыйна-зямельных працаўнікоў, прапанаваўшы парткамітэтам у ліку асоб, якія будуць камандыраваны, забясьпечыць пасылку жанчын-вылучэнак.

Апроч таго, ЦК прызнаў неабходным устанавіць для 1929-30 навучальнага году 100 чалавек асьпірантаў для падрыхтоўкі навуковых працаўнікоў у галіне калектыўнага землярбства ў навукова-дасьледчых установах Галоўнавукі і с.-г. ВНУ Галоўпрафасьветы.

10 год савецкай улады ў Заходняй Украіне.

Харкаў, 16-7. Прайшло 10 год з часу абвяшчэньня савецкай улады ў Заходняй Украіне.

Савецкая ўлада праіснавала там толькі 2 месяцы і была прыдушана ботам польскага фашызму. Гэтая дата адзначана па ўсёй Украіне шматлікімі дэманстрацыямі.

Запасны фонд збожжа.

ХАРКАЎ, 16-7. Сёлета на Украіне ўпяршыню адкладаецца спэцыяльны запасны насенны фонд у 1.150.000 цэнтнэраў збожжа для забясьпекі патрэб сельскае гаспадаркі на выпадак стыхійнай навалы.

Першае насельніцтва на высьпе „Франца Іосіфа“

МАСКВА, 16-7. У Архангельск выехаў тав. Сьмідт, назначаны СНК СССР начальнікам экспэдыцыі на зямлю Франца Іосіфа. Перад выездам т. Сьмідт у гутарцы з супрацоўнікам ТАСС паведаміў аб экспэдыцыі наступнае: «Зямля Франца Іосіфа—першая паўночная тэрыторыя нашага Саюзу. Згрупаваньне выспаў яшчэ амаль што не дасьледавана і зусім ня выкарыстана. Між тым, пабудаваньне на нашых паўночных выспах вялікай мэтэаралёгічнай станцыі і радыё-станцыі адпаведнае магутнасьці мае вялікае значэньне для прадказаньняў надвор'я СССР, ня кажучы ўжо пра абслугоўваньне непасрэдна суднаў, якія плаваюць у паўночных морах.

Мы вязём з сабою належнае абсталяваньне і разборныя пабудовы для станцыі і кватэр і пакінем на высьпах першае насельніцтва ў складзе 7-мі адважных асоб. Гэта будзе першае паўночнае насельніцтва ў сьвеце. Склад гэтага насельніцтва — 2 мэтэаралёгі 2 радысты, доктар, повар і вартаўнік.

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ.

ПОЎНЫ ПРАВАЛ ФАШЫСЦКІХ ПЛЯНАЎ.

ВАРШАВА, 16-VII. Пасьля першага ўрачыстага пасяджэньня зьезду зарубежных палякаў, зьезд нібы спыніўся. Працуюць толькі камісіі, прычым аб іх гутарках у друку няма ніводнага слова

Мандатная камісія пераабрана. Невядома нават, колькі прыехала на зьезд дэлегатаў. Водлуг адных вестак, прыехала толькі 80 дэлегатаў, водлуг другіх—110. Захоўваецца таксама поўнае маўчаньне аб тым, як абіраліся гэтыя дэлегаты на мясцох.

АНГЕЛЬСКІ МІНІСТР У ВАРШАВЕ.

ВАРШАВА, 16-VII. Ангельскі міністр Том-Шоу, які прыляцеў у Варшаву на пасяджэньне выканкому міжнароднага аб'яднаньня тэкстыльшчыкаў, не рабіў ніякіх візытаў прадстаўнікам польскага ўраду і выехаў у Лёндан зараз-жа пасьля пасяджэньня.

ФАКТ СТРАЛЯНІНЫ ПАЛІЦЫІ Ў ДЭПУТАТАЎ СОЙМУ ПАЦЬВЯРДЖАЕЦЦА.

ВАРШАВА, 15-VII. Пацьвярджаецца паведамленьне аб тым, што дэпутаты Беларускай Рабоча-Сялянскай фракцыі сойму Гаўрылюк і Крамчук паранены стрэламі з рэвальвэраў на мітынгу ў беларускім мястэчку Карэлічы. Друк пацьвярджае таксама меркаваньне аб тым, што ў іх стралялі пераапранутыя ў цывільнае адзеньне паліцэйскія.

Чыноўнікі ня здольны знайсьці на мапе СССР

НЬЮ-ЁРК, 16-VII. Наконт надыходзячага падарожжа ў СССР запрошаных савецкімі арганізацыямі амэрыканскіх інжынэраў-спэцыялістаў па тэкстыльным машынабудаўніцтве орган дзелавых колаў „Джорналь оф Комэрс“ піша: «Новая дэлегацыя амэрыканскіх спэцыялістаў накіроўваецца ў СССР—краіну, з якою нашы дзелавыя людзі ўсё больш і больш знаёмяцца, але якую нашы чыноўнікі ўсё яшчэ ня здольны знайсьці на геаграфічнай мапе.

Гандаль з СССР набывае для нас усё большае і большае значэньне. Разумныя людзі задаюць запытаньне, ці настаў той момант, калі мы павінны цьвяроза паглядзець на пытаньне аб узаемаадносінах з СССР. Дзелавыя колы Злучаных Штатаў у поўнай меры ня могуць узяць такога выгоднага ўдзелу ў розных вялікіх прамысловых і сельска-гаспадарчых рэсурсах СССР, пакуль наш урад упарта лічыць, што СССР ня існуе. Савецкая ўлада даўно ўжо ўмацавалася, не зважаючы на шматлікія чуткі аб яе заняпадзе».

Патрабаваньне прызнаць СССР у апошні час усё больш настойліва высоўваецца газэтамі, асабліва правіцыйнымі.

* *
*

БЭРЛІН, 16-VII. Амэрыканская эканамічная дэлегацыя сёньня ўвечары выехала ў Маскву.

Тав. Дабраджэану вызвален.

ВЕНА, 15-VII. Паведамленьні з Бухарэсту пацьвярджаюць, што румынскі рэвалюцыянэр т. Дабраджэану—Гэра вызвален з астрогу. Бухарэсцкі суд устанавіў, што ўчынкі Дабраджэану—Гэра падлягаюць амністыі.

Урад Пуанкарэ атрымаў давер'е.

ПАРЫЖ, 16-7. «Палата дэпутатаў, выказаўшы давер'е ўраду, адхіліла большасьцю 304 проці 239 галасоў прапанову аб адтэрмінаваньні ратыфікацыі даўгавых згод».

Выкрыем антыленінскую палітыку і практыку правых.

«КЛЯСАВАЯ» ЛІНІЯ ШАЦКАГА І НАВАСЁЛКАЎСКАГА СЕЛЬСАВЕТАЎ.—ЗЯМЛЮ РАЗЬМЯРКОЎВАЮЦЬ НЕ ПА МАЕМАСНЫМ І САЦЫЯЛЬНЫМ СТАНОВІШЧЫ, А „ПА ДУМЦЫ СТАРШЫНІ“.—НА ПАСАДЫ ПРЫЗНАЧАЮЦЬ ЗАМОЖНЫХ.—ЗАМЕСТ ВЫЧЫШЧАНЫХ ПРЫМАЮЦЬ ПАДКУЛАЧНІКАЎ.

Скрыўленьне клясавай лініі на Мазыршчыне.

Аб скрыўленьні клясавай лініі ў індывідуальным абкладаньні, якія дапушчаюцца сельсаветамі, ужо адзначалася. Гэткае-ж становішча мае цца і ў Мазыршчыне. Нагдядаецца шмат выпадкаў абкладаньня бязумоўна серадняцкіх гаспадарак (Капаткевіцкі РВК), з другога боку не абкладаюцца заведама кулацкія гаспадаркі (Петрыкаўскі і Каралінскі РВК).

Звычайна больш яскравыя памылкі выпраўляюцца РВК. Але ў Петрыкаўскім і Каралінскім-жа раёнах скрыўленьне клясавай лініі ў індывідуальным абкладаньні азначаецца якраз з боку РВК. Зусім правідловыя і клясава вытрыманыя пастановы сельскіх вучотных камісій, пацьверджаных пастановамі сходаў бедняты і сельсаветаў, раённай падатковай камісіяй адмяняюцца, бязумоўна кулацкія гаспадаркі вызваляюцца ад індывідуальнага абкладаньня.

Асавецкі сельсавет (511 гаспадарак) прадстаўляе для абкладаньня 16 гаспадарак. Раённая камісія не абкладае ніводнае, у тым ліку, напрыклад, і гаспадарку Бэка (14 дзес. зямлі, 15 галоў буйнай жывёлы, наёмная праца).

Па Брынеўскаму сельсавету прадстаўлена да абкладаньня 7 гаспадарак. Раённая камісія не абкладае ніводнай. У тым ліку гаспадарка Рудніка (9 галоў буйнай жывёлы, 400 руб. даходу ад продажы коняй).

Сельская вучотная камісія Бабуніцкага сельсавету прапануе абкласьці ў індывідуальным парадку гаспадарку Савута Ігната (17 дзес. зямлі, 10 галоў буйнай жывёлы). Сельская камісія прыводзіць і матывы: гаспадарка пазычае грошы і прадукты на адработку. Камісія ўказвае і прозьвішча даўжнікоў, якія Савут прымушаў у процантах за пазыку працаваць на яго суквавальцы. Раённая-ж камісія без усякай матывіроўкі вызваляе ад абкладаньня.

У матывах занясеньня ў сьпіс для індывідуальнага абкладаньня па гаспадарцы Корбута Хведара зазначаецца: пазычка грошай на проценты і прадуктаў на адработку. Прыведзены прыклады, каму ён пазычаў, колькі грошай і колькі дзён прапаваў у яго даўжнік. Сход бедняты пацьвярджае ўсе прыведзеныя факты. А пастанова раённай камісіі гласіць: абкласьці ў звычайным парадку і са сьпісу па індывідуальнаму абкладаньню выключыць.

Курчыцкая сельская вучотная камісія і сход бедняты настойваюць на абкладаньні ў індывідуальным парадку гаспадарку Сітніцы за скупку і продаж жывёлы, продаж хлеба па спэкулятыўных цэнах, наём сэзонных рабочых. Прыводзяцца прозьвішчы шэрагу асоб, якія сьведчаць аб прыведзеных фактах, а пастанова раённай камісіі ўсё-ж гласіць—у звычайным парадку.

Ня лепш абстаіць справа і ў Каралінскім раёне. Выдатныя па сваёй моцнасьці, усім вядомыя кулацкія гаспадаркі індывідуальным парадкам не абкладзены. Сярод неабкладзеных, нават не занесеных у сьпісы, маюцца гэткія: Агароднік —зямлі 28,5 дзес., буйнай жывёлы—27 галоў, дробнай жывёлы—50 галоў, даходу—1813 руб., падатак у мінуўшым годзе—388 руб., Агароднік (брат першага), Захарчык, Даўцяг—таксама маючыя багатыя гаспадаркі.

А вось гаспадарка Каваленка, якая мае 26 дзес. зямлі, 25 галоў буйнай жывёлы, 1536 руб. даходу. Аб гэтай гаспадарцы сельская вучотная камісія вызначае, што яна наймае сэзонную рабочую сілу і здае хлеб на проценты. Сход бедняты настойвае на абкладаньні гаспадаркі ў індывідуальным парадку, а раённая камісія „папраўляе“ клясавы падыход сходу і выносіць пастанову аб абкладаньні Каваленка ў звычайным парадку.

З другога боку гаспадарка, якая мае 7 дзес. зямлі, 1 каня, 3 каровы, 400 руб. даходу, 8 едакоў (з якіх працаздольных 1) і плаціла падатку 27 руб. абкладаецца ў індывідуальным парадку, хаця і сельская вучотная камісія і сход бедняты і сельсавет выказваюцца за звычайнае абкладаньне.

Вось як праводзяць „клясавую“ лінію.

Грунтфэст.

Як „праводзяць“ партыйную лінію

(Ад нашага бабруйскага карэспандэнта).

У Бабруйскім Акрземаддзеле ня ўсё ладна. Ёсьць выпадкі заядлага бюракратызму, ёсьць і скрыўленьне клясавай лініі. Яшчэ нават у леташнім годзе акруговы зямельны аддзел ня меў цьвёрдае ўстаноўкі на стварэньне пры землеўпарадкаваньні калгасаў і пасёлкаў. Значная доля землеўпарадкавальнай працы мела ўстаноўку на хутары і атрубы. Каморнікі (праўда, ня ўсе), гралі на дудку кулака і стараліся часам падлажваць так справу, што фармальна нібыта праводзіла нарэзку пасёлкаў, а ў самдзеле гэта былі хутары або атрубы.

Гэтым праславіўся рэвізор Клішэвіч, які ў мінулым годзе на 400 гэктарах правёў „сталыпінскае“ землеўпарадкаваньне ў Старобінскім і Чырвона-Слабодзкім раёне. Па-ягонаму шляху пайшлі каморнікі Козыраў і Гэльфанд. Яны таксама на вялікай плошчы правялі нарэзку хутароў пад выглядам пасёлкаў.

Характэрным зьяўляецца той факт, што належнага рэагаваньня і кантролю над праведзенаю працаю з боку Акрземаддзелу тут ня было.

Няладная справа і з абрэзкамі кулацкіх гаспадарак. Гэтая работа настолькі зацягнулася, што і ў сучасны момант па многіх раёнах праводзіцца у той час, як ужо даўным даўно абрэзка гэтых гаспадарак павінна была быць скончана.

Сярод лясного апарату наглядаецца таксама зрастаньне з кулацкім элемэнтам і адсюль скрыўленьне клясавай лініі. П'янства лясной варты з кулацтвам на вёсцы, продаж лесу заможнаму сялянству. З боку-ж інспэктарыяту лясоў належнага рэагаваньня на гэтыя зьявы няма. На селькораўскія заметкі па гэтых пытаньнях не зварачаюць ніякай увагі.

Нізавая сетка крэдытных таварыстваў таксама мае факты няправільнага правядзеньня клясавае палітыкі і крэдытаваньня сялянства. Вось, напрыклад, Асавецкае крэдытнае таварыства, Любаньскага раёну, кулаку выдае крэдыт у 120 руб. Млынару таксама даецца крэдыт і апрача таго, гэтым асобам крэдыт выдаецца на болей ільготных умовах, чым селяніну бедняку. Бывала і так, што кулаку выдавалі доўгатэрміновы крэдыт, а бедняку кароткатэрміновы.

У Акруговым Зямельным аддзеле выяўлена цэлы шэраг зямельных спраў, якія маюць ужо даволі вялікі стаж цяганіны. Справа аб надзяленьні бедняты вёскі Надзейкавічы, Рагачэўскага раёну цягнецца з 1927 году. Бывалі выпадкі, калі 19 сялян былі выкліканы на суд у Бабруйск, дарэмна пратрапалі па 50 вёрст і, урэшце аказалася, што ім ісьці ня было за чым, бо справа іх яшчэ не паступіла ў акруговую зямельную камісію.

Гэта толькі некаторыя характэрныя факты бюракратызму і скрыўленьня клясавай лініі ўстановамі Бабруйшчыны. Сьведчаць яны аб тым, што нам трэба болей рашуча праводзіць клясавую лінію ў працы і ачысьціць свой апарат ад людзей, якія скрыўляюць клясавую лінію і праяўляюць бюракратызм.

А. Дамброўскі.

„Міласьць“ старшыні сельсавету.

(Казіміраўскі сельсавет, Жлобінскага раёну).

Старшыня Казіміраўскага сельсавету Рудкоўскі разьмеркаваў зямлю запаснога фонду ў м. Казіміраве.

Зямлі было шмат, у большасьці зямля добрага гатунку. Таксама было і шмат заяў жадаючых атрымаць зямлю.

Але разьмеркаваньне праходзіла ня згодна заяў у якіх відаць маемаснае і сямейнае становішча, а па думцы старшыні.

Вось адзін факт: гр. м. Казімірава Азарэвіч Сяргей Максімаў мае 7 асоб сям'і. Мае наступнае: пасёлак на імя сына, які жыве разам, бо пасёлак атрыман у 1923 годзе, але да гэтага часу нічога не пабудавана, бо не жадае; прырэзак на імя бацькі, які жыве таксама разам і яшчэ два прырэзкі, ня лічачы сялібы. Зямля ўся добраякасная.

Але Азарэвічу, як чалавеку вельмі зайздроснаму, зямлі гэтай мала і вось незаконным шляхам купляе ў грамадзяніна Вальфсона Шлёмы 2 дзесяціны агароду. Сельсавет пераводзіць гэту зямлю ў запасны фонд для разьмеркаваньня паміж беззямельнымі. Вось тут і выявілася нешта няладнае паміж сельсаветам і Азарэвічам і сельсавет перадае гэту зямлю, ня гледзячы на тое, што яна незаконна пакуплена, т. Азарэвічу.

Батраку Рублёўскаму Герасіму, зусім беззямельнаму, дае як «адчапнога» маленькі кавалак зямлі, гр. Кісялю Парфіму таксама дае за некалькі вёрст зямлі у той час, як ён малады гаспадар і ня зможа яе, з-за далёкасьці, апрацаваць.

Селянін.

„Клясавая“ лінія ў працы сельсавету

(Па матар'ялах Шацкага і Навасёлкаўскага с.-с., Пухавіцкага раёну)

Нельга сказаць, што гэтыя сельсаветы вядуць кулацкую лінію, але маецца намала паасобных выпадкаў і відавочнага парушэньня клясавай лініі.

Некалькі прыкладаў.

Гн ліленьне на пасёлкі, пры землеўпарадкаваньні беднякоў і застаўленьне на месцы заможнага сялянства (Шацкі і Навасёлкаўскі сельсавет), што нас нават масавае зьявішча. Або збор усім у адзінакавай лічбе, па 26 к. з дзесяціны, на выдаткі па камунальнаму абслугоўваньню каморніка (в. Навасёлкі). Аслабаненьне ад с.-г. падатку па скідачнаму фонду досыць моцных серадняцкіх гаспадарак з прыбыткам звыш 250 р. гаспадаркі Капца П. з хут. Ноўкі Навасёлкаўскага сельсавету, даход якой 288 р., гаспадаркі Мазаніка П. з вёскі Баравая Слабада, у гаспадарцы якога 8,5 дзесяцін зямлі, конь і карова, даход 301 руб. Адначасова ня вызвалены такія гаспадаркі відавочна, бядняцкія, як гаспадарка Стральскага Я. з Скрыльскай Слабады Навасёлкаўскага савету, якая ня мае каровы пры даходнасьці ў 128 руб. Назіраецца па Навасёлкаўскім сельсавету таксама пераабкладаньне серадняцкіх гаспадарак і недаабкладаньне ў індывідуальным парадку, - бясспрэчна кулацкіх гаспадарак, напрыклад: гр. Рамаоўскі в. Дайновы, які плаціў у 27-28 г. 86 р. падатку, абложан у індывідуальным парадку на 204 руб., яго гаспадарка—17,5 дзес. зямлі, 2 каві, 3 каровы, едакоў—6.

А вось гр. Паўловіч з хут. Саміна, які ў значным разьмеры прымяняе наёмную рабочую сілу (да 100 рабочых за лета) плаціў у мінулым годзе 240 р. падатку, пры 18 дзес. зямлі і значна большай колькасьці жывёлы, абложан звычайным, а не ў індывідуальным парадку.

Хлеб з каапэрацыі атрымоўвае заможны гр. Ляпкоўскі з вёскі Загай Навасёлкаўскага сельсавету, а ня ўнесены ў сьпісы на хлеб—беззямельны і інвалід гр. Голуб і ўдава Размысловіч ня маючая каня. Шацкі сельсавет зусім не рэагуе на такія зьявішчы, калі заможная частка пасёлку на сваіх вучастках касуе самавольна дарогу, якая праведзена каморнікам і праводзіць гэту дарогу праз вучасткі бяднейшай часткі насельніцтва. Заявы аб гэтым ляжаць бяз руху. І, урэшце, гісторыя з „гнядым бычком“, калі ў бедняка в. Блонь Пухавіцкага раёну за высечаны алешнік на дровы наклалі 27 р. 20 к. і прадалі бычка. Гэта яскравы прыклад самага грубага парушэньня клясавай лініі ўжо ня толькі Блонскім сельсаветам, але і Пухавіцкім РВК і Менскім земаддзелам.

Трэба, акрамя выпраўленьня паказаных момантаў скажэньня лініі партыі і ўлады, завастрыць на гэтых пытаньнях увагу ўсёй нашай вясковай грамадзкасьці. Бо на гэтым вучастку клясавай барацьбы паміж кулаком і нашым аграмаджаным сэктарам, кожная ўступка кулаку ўзмацняе яго пазіцыі і замаруджвае наша наступленьне на капіталістычныя элемэнты вёскі.

Я.

„У прыёме адказаць“.

(Рагачэўскі раён)

Дагэтуль справа замены вычышчаных з Ціхінскага л-ва вытвараецца вельмі кепска.

У гэтай справе ня прымае шырокага ўдзелу грамадзкасьць, а той хто спадабаўся лясьнічаму, або старшыні рабачкому твар падаўшага заяву, будзе прыняты на пасаду лясьніка, або аб'езчыка, а калі ты бядняк—ды яшчэ партызан згубіўшы здароў'е ў часе заваевы Кастрычніка, дык ты ня прыгожы, дык цябе і ня прымае на пасаду лясьніка.

Яшчэ хужэй бывае: калі заместа выкінутага падкулачніка прымаюць зноў падкулачніка, або яшчэ мацнейшага.

Аб гэтым могуць сьведчыць два факты: першы: падача заявы бедняком Магілёўцавым Сяменам з вёскі В. Крушынаўкі, дзе сельсавет выдаў належныя дакуманты, якія не супярэчаць прыёму, але лясьнічы ў прыёме адказаў. Другі факт, які меў месца ўжо пры другім лясьнічым: справа партызана Мацьвеява Аляксея, які два гады хадайнічае, каб паставілі лясьнікам. Цяперашні лясьнічы ўжо і паабяцаў даць месца, але нашоўся падкулачнік Кавалёў Сідар, які сказаў, што Мацьвееў будзе дрэнным вартаўніком—і яго не прынялі.

Такім чынам марынуюцца два бедняні Ціхінскім л-вам, тут маюцца і рабачком і парт'ячэйка—а ўвагі ніякай няма.

Я. Кр.

Сельсавет дапамагае кулакам.

(Вёска Хутар, Калінкавіцкага р.).

Стогне бедната вёскі Хутар ад кулакоў і заможнікаў. Кулакі і заможнікі захапілі каля 800 гэктараў зямлі земфонду на апрацоўцы якой эксплёатуюць бедняту. Бедната ўжо няраз падымала пытаньне на агульных сходах аб гэтай зямлі, але кулакі атрымліваюць верх.

— Чаго вы, кажуць, крычыцё: мы ўзялі, дык мы і плоцім падатак 300 рублёў.

А калі бядняк актывіст Мухаедаў падаў у мінулым годзе заяву Калінкавіцкаму РайЗА аб тым, што кулакамі і заможнікамі ўкрыта 500 гэктараў зямлі, дык заможнікі яму сьсеклі 20 штук садовых дрэў.

За гэтае злачынства раённыя органы ніякіх мер ня прымаюць.

Вока.

КУЛАК НЕ АБКЛАДЗЕН.

У Махаўскім сельсавеце, Лупалаўскага раёну, пражывае Мікіцін Антон, які заняў сядзібу былога абшарніка Савіцкага хутар у 12 дзесяцін зямлі, эксплёатуе наймовую працу і якім-та цудам ў 1929 г. індывідуальным падаткам не абкладзен, ня гледзячы на тое, што ў самым Лупалаўскім РВК служа сакратаром Латумкін Ахрэм, які добра ведае Мікіціна, бо на працягу апошніх трох гадоў быў старшынёй Махаўскага сельсавету. Ці не баіцца Латумкін Мікіціна, каб апошні ня ўсердзіўся і ня расчыніў былых сельсавецкіх прадзелак Латумкіна. Неабходна будзе акруговай падатковай камісіі праверыць гэта пытаньне.

Каршун.

ПАДТРЫМЛІВАЕ КУЛАКОЎ.

(Слатоўскі сельсавет, Аршаншчына).

У Слатоўскім сельсавеце ёсьць старшыня Пятроўскі, маемасьць якога вышэй сярэдняй. Заўсёды гэты старшыня па нашым сельсавеце падтрымлівае кулакоў.

Ён надта кепска адносіцца да сваіх абавязкаў. Заявы, якія дае яму бедната,—ён ня выконвае, ляжаць у яго па цэлых месяцах, а калі хто небудзь пажадае ўзяць сваю заяву назад, дык ён яе не аддае датуль, пакуль не падаюць скаргу РВК. Трэба Пятроўскага вычысьціць.

Ведаючы.

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Кантрактацыя зімовых пасеваў.

Ворша, 16-7. У гэтым годзе па акрузе будзе закантрактавана зімовых пасеваў па індывідуальных гаспадарках 3365 гэкт.

Гэта колькасьць ужо разьмеркавана па асобных раёнах. Па калгасах будзе закантрактавана 500 гэкт. зімовых пасеваў.

Перад Наркамземам ставіцца пытаньне аб мэтазгоднасьці распаўсюджваньня сярод гаспадарак акругі пяткускага жыта, бо ў гэтым годзе ва многіх саўгасах, калгасах і асобных гаспадарках пяткускае жыта загінула.

Прэзыдыум акрвыканкому прапанаваў акрсельсаюзу ў тэрміновым парадку паслаць раёнам усе заданьні і кіруючыя матар'ялы па практычнаму правядзеньню кантрактацыі. У сваю чаргу райвыканкомы павінны заданьні разьмеркаваць паміж асобных сельскагаспадарчых крэдытных таварыстваў, а таксама правесьці шырокую падрыхтоўчую і растлумачальную работу сярод насельніцтва аб мэтах кантрактацыі зімовых пасеваў.

Кантрактацыя будзе праводзіцца выключна групавым мэтадам, і пераважна ў вытворчых аб'яднаньнях.

А. К.

Падрыхтоўка да асеньняй сяўбы.

ГОМЕЛЬ, 16-7. Згодна рашэньня апошняга пленуму акрвыканкому сельсаветы павінны да 20-га ліпеня скончыць складаньне пляну правядзеньня асеньняй пасеўнай кампаніі. Між тым, некаторыя райвыканкомы толькі цяпер разаслалі арыентыровачныя пляны па сельсаветах. Каб не паўтараць памылкі мінулых кампаній акрземаддзел даручыў раённым працаўнікам праверыць ход падрыхтоўкі да асеньняй пасеўнай кампаніі і дапамагчы сельсаветам у складаньні практычных пляноў.

На палепшаньне мэддапамогі рабочым.

Ворша, 16-7. Існуючая пры заводзе „Чырвоны Кастрычнік“ рабочая амбуляторыя, абслугоўвала апрача рабочых і сялянства вакольных вёсак. Дзякуючы гэтаму, амбуляторыя была вельмі загружана і ні сялянства, ні рабочыя не атрымоўвалі належнай мэдыцынскай дапамогі. Такое становішча прэзыдыум акрвыканкому прызнаў ненармальным і пастанавіў адчыніць з новага бюджэтнага году пры заводзе «Чырвоны Кастрычнік» новую амбуляторыю для абслугоўваньня рабочых. Сродкі на новую амбуляторыю будуць унесены ў каштарысы новага бюджэтнага году. Сучасная амбуляторыя будзе абслугоўваць толькі сялян.

Папулярнасьць тэатру Галубка.

Гомель, 16-7. Вандроўны тэатр кір. Галубка працуе цяпер у ...скім раёне.

Найбольш праца праходзіць ... лікіх сёлах у вялікіх пунях, ... раюцца сяляне з ваколічных ...

У м. Лоеве, у дзень сьвята ... цыі былі дадзены тры канцэрты ... чым адзін адбыўся на плошчы ... жана звыш 5000 сялян. У дзень ... та Пятра ніхто з сялян вёскі ... не пайшлі ў царкву, дарэмна ... гі час звапіў.

З м. Камарына тэатр накіру... Брагін-Хойнікі.

На 3-ю пазыку.

ГОМЕЛЬ, 16-VII. На многіх ... прыёмствах пачалася папярэдняя ... піска на 3-ю пазыку індустрыялізацыі. На заводзе „Пралетары“ работніцы ... зурава падпісалася на 300 руб. ... рабочыя падпісваюцца на 200 ...

Акруговая сялянская спартакіяда.

Ворша, 16-7. Пачалася падрыхтоўчая работа да акруговай сялянскай спартакіяды. ... арганізацыю і правядзеньне якой ... дыум акрвыканкому прызнаў ... Намесьніку старшыні акрвыка... і акруговаму інспэктару ахоўы ... даручана правесьці падрыхтоўчую ... ту да спартакіяды, уцягнуць у ... сельсаюз, акркалгасаюз і Дняпро... правядзеньне спартакіяды акрвы... адпусьціў 200 руб. Акрсельсаю... саюз і Днепрасаюз таксама ... сродкі на гэту мэту.

ВУЧОТ АБ'ЕКТАЎ АБКЛАДАНЬНЯ СКОНЧАН.

На мясцох прыступілі да налічэньня падатку.—Трэба поўнасьцю выявіць кулацкія гаспадаркі і іх сапраўдны даход.—Праверыць—ці ўсе бядняцкія гаспадаркі вызвалены ад падатку.—Сялянства пачынае спаборніцтва на датэрміновую аплату падатку.

ВЫНІКІ ВУЧОТУ.

Вучот аб'ектаў абкладаньня па БССР ужо скончан, на мясцох пачалося налічэньне абкладаемага даходу і падатку.

Папярэднія весткі па 531.000 гаспадарках (67 проц. агульнага ліку) сьведчаць аб тым, што пахаць супроць мінулага году павялічылася на 2,9 пр., пасеў—на 4,2 проц., сенажаць—на 4,6 проц., колькасьць коняй—на 0,9 проц. і незямляробскія заработкі—на 25 проц. Крыху зьменшылася колькасьць буйнай рагатай жывёлы (на 1,1 проц.) і сьвіней (на 5,2 проц.). Апошняе тлумачыцца, галоўным чынам, доўгай і суровай зімой, недахопам корму і часткова морам на жывёлу, але разам з тым ёсьць і некаторы непадлік жывёлы, асабліва ў Віцебскай і Полацкай акругах.

У галіне індывідуальнага абкладаньня мы маем такія вынікі: ужо выяўлена 12.800 кулацкіх гаспадарак, або 1,6 проц. агульнага ліку двароў у БССР. У параўнаньні з мінулым годам гэтыя вынікі можна лічыць здавальняючымі, бо летась было абкладзена толькі 3200 кулацкіх гаспадарак. Але ні ў якім разе нельга сказаць, што ахоплены і сёлета ўсе кулацкія гаспадаркі. Ёсьць яшчэ шмат кулацкіх гаспадарак, якія захаваліся ад індывідуальнага абкладаньня і іх неабходна выявіць.

ПРАВЫЯ ЎХІЛЫ.

Абсьледаваньне працы на мясцох гаворыць аб тым, што якасьць індывідуальнага абкладаньня сёлета наогул лепшая за леташнюю, але ўстаноўлена шмат выпадкаў, калі сельсаветы і **нават раённыя працаўнікі нядбайна адносіліся да гэтай справы і часамі проста не жадалі выяўляць кулакоў.** Напрыклад, у **Мазыршчыне па Брынеўскаму сельсавету** яўны кулак, якога сход бедняты высунуў у сьпіс для індывідуальнага абкладаньня, раённай камісіяй быў выключан з гэтага сьпісу толькі таму што яго бараніў старшыня сельсавету, як потым высьветлілася—сваяк гэтага кулака.

У Новасёлкаўскім сельсавеце (Гомельшчына) **сэкратар камсамольскай ячэйкі ўпарта абараняў некалькіх кулакоў.**

У Магілёўшчыне адзін старшыня сельсавету—жанчына проста схавалася ад прадстаўніка Наркамфіну, які прыехаў праверыць індывідуальнае абкладаньне. Потым высьветлілася, што муж яе—настаўнік мае кулацкую гаспадарку, якая ў другім сельсавеце абкладзена індывідуальна.

НЯ ЎСЮДЫ КАРЫСТАЮЦЦА ДАПАМОГАЙ БЕДНАТЫ.

Нельга не адзначыць таго факту, што далёка не заўсёды скарыстоўваецца, як належыць, дапамога сялянскай беднаце. Было шмат выпадкаў, калі сходы бедняты пры правядзеньні індывідуальнага абкладаньня зусім ня склікаліся, а старшыні сельсаветаў паведамлялі райвыканкам, што ў іх кулакоў няма. Калі-ж на месца выяжджалі прадстаўнікі РВК і склікалі сходы бедняты, то на апошніх выяўлялася шмат кулацкіх гаспадарак. Такія выпадкі мелі месца ва ўсіх акругах БССР.

ПРАВЕРЫЦЬ СЬПІСЫ ПА ІНДЫВІДУАЛЬНАМУ АБКЛАДАНЬНЮ.

Вось чаму працу па высьвятленьню кулацкіх гаспадарак трэба працягваць, але разам з тым неабходна зьвярнуць увагу на дасканалую праверку складзеных сьпісаў, бо ёсьць выпадкі, калі ў сьпісы па індывідуальнаму абкладаньню папалі асобныя серадняцкія гаспадаркі. Раённыя падатковыя камісіі павінны гэтыя гаспадаркі выключыць са сьпісаў індывідуальнага абкладаньня. Ня менш важна праверыць і поўнасьцю падлічыць абкладаемы даход у кулацкіх гаспадарках, бо ўжо зараз дзе-ні-дзе назіраецца тэндэнцыя даваць кулаком мізэрную надбаўку да даходу ў 10-15 руб. Пры такіх умовах, зразумела, ня выканаеш задач, якія стаяць перад намі—нагнаць падвышаную даходнасьць у кулацкіх гаспадарках і спыніць капіталістычнае накапленьне шляхам вострай прагрэсіі ставак падатку. Райвыканкомы і акрфінаддзелы павінны пільна сачыць за тым, каб у кулацкіх гаспадарках быў улічан увесь іх сапраўдны даход.

БЕДНАТА НЕ ПАВІННА ПЛАЦІЦЬ ПАДАТКУ.

Назіраюцца памылкі і ў справе вызваленьня ад падатку бедняты. ... бядняцкіх гаспадарак складаюцца ... на, часамі не абгаварваюцца на ... дах бедняты. Ёсьць выпадкі ўключэння ў сьпісы бедняты зусім ня... здольных гаспадарак; у асобных ... саветах ня ўся бедната ахоплена ... самі. Раённыя падатковыя камісіі ... вінны дасканала праверыць ... сьпісы, каб забясьпечыць поўнае правільнае вызваленьне ўсіх бядняцкіх гаспадарак ад падатку. Гэту ... трэба абавязкова скончыць да ўручэньня акладных лістоў, каб бедната ... гадзя ведала, што яна падатку ... ціць ня будзе. Трэба таксама да ... чэньня акладных лістоў разьмеркаваць усе ільготы, якія прызначаны ... наму сялянству за пашырэньне ... най плошчы, за ўздым ураджайнасьці і за калектывізацыю. У сувязі з тым важнае значэньне набывае ... прадстаўнікоў сялянства ў падатковых камісіях.

Неабходна дабіцца таго, каб у ... місіі прайшлі прадстаўнікі бядняцкіх і серадняцкіх груп сялянства і каб ... папалі ў камісіі заможнікі або кулакі, як гэта назіралася ў асобных вы... ках летась.

РАЗГАРНУЦЬ СПАБОРНІЦТВА МІЖ АСОБНЫМІ ВЁСКАМІ.

Акладныя лісты паводле дырэктывы ураду павінны быць уручаны не пазней 10 жніўня, бо ўжо ў верасьні пачынаецца першы тэрмін уплаты сельска-гасп. падатку для шэрагу сельсаветаў.

Працу па ўручэньню акладных лістоў трэба скончыць у тэрмін, тым больш, што сялянства, не чакаючы тэрміну, пачынае плаціць свой ... так. Так, на Меншчыне і Мазыршчыне было шэраг выпадкаў калектыўнай аплаты першай часткі сельска-гаспадарчага падатку, і сялянства выклікала на спаборніцтва за датэрміновы ўзнос падатку суседнія вёскі. Гэта ... кненьне сялянства трэба скарыстаць поўнасьцю і як мага хутчэй скончыць уручэньне акладных лістоў, каб ... на было разгарнуць спаборніцтва ... між асобнымі вёскамі, сельсаветамі, раёнамі за своечасовую аплату падатку.

В. З-ў.

СУПРОЦЬ ПРАВАГА ЎХІЛУ НА ПРАКТЫЦЫ

„... У даных умовах найвялікшай небясьпекай унутры партыі зьяўляецца правы ўхіл, як выраз простага адказу ад ленінскай палітыкі партыі...“

(З рэзалюцыі XVI канфэрэнцыі ЎсеКП(б).

Быў час, калі партыі прыходзілася змагацца з правымі на тэарэтычнай аснове—гэта былі толькі тэарэтычныя бойкі.

Але цяпер, калі ў нас ёсьць цэлы шэраг фактаў, якія паказваюць скрыўленьне партыйнай—ленінскай лініі ў практычнай працы, мы павінны рашуча падысьці да барацьбы з правым ухілам і прымірэнцтвам, да барацьбы з тымі ўхіламі, якія выяўляюцца ў практычнай працы.

Што мы маем у практычнай працы? Дзе ў нас ёсьць гэты ўхіл на практыцы? У многіх мясцох, асабліва ў галіне правядзеньня клясавай лініі на вёсцы. Там можна вельмі часта гэта прасачыць. Возьмем факты.

«З 1-га красавіка Ляднянскае сельска-гаспадарчае крэдытнае таварыства пачало праводзіць кантрактацыю масеваў...

Старшыня праўленьня тав. Земчын у гэтым выяўляе свой „клясавы падыход“: калі прыносяць зацьверджаныя сельсаветам сьпісы, ён адным росчыркам пяра выкрэсьлівае бедняту, як гэта было, напр., з грамадзянкай вёскі Белі, Бельскага сельсавету, Какошынай Параскай: удава, мае 4 дзесяціны зямлі, ня мае ні каня, ні каровы, сельска-гаспадарчага падатку ня плаціць, каапэравана ў сельска-гаспадарчым таварыстве з фонду бедняты. Калі яна ў ліку іншых грамадзян была сельсаветам занесена ў сьпісы на кантрактацыю, дык **Земчын яе выкрэсьліў, кажучы: „У яе маемасьці няма, ня будзе з чаго спагнаць“.** «Па тав. Земчыну выходзіць, што трэба даваць толькі таму, хто мае моцную гаспадарку...“—канчае свой допіс селькор.

Тэорыя вядзе за сабой практыку. І вось з гэтай „практыкай“ мы яшчэ слаба вядзем барацьбу. Іншы раз правы ўхіл у практычнай працы мы прымаем за простае непаразуменьне, за памылку з боку таго, хто яе робіць. Але тады, калі гэта ўваходзіць і ня толькі ўваходзіць, а ўвайшло ў сыстэму працы шмат якіх нашых устаноў,—мы павінны змагацца з гэтым больш рашуча.

Зусім ня рэдкі факты абароны камуністамі кулакоў,—факты атрыманьня хлеба кулакамі, у той час, калі бедната застаецца бяз хлеба; усялякія скідкі робяць багатаму сялянству, а бедната чакае... Нават ёсьць выпадкі, калі штучнае ўгнаеньне, замест разьмеркаваньня сярод бедняты, даюць кулаком і такім, якія пазбаўлены выбарчага голасу.

У свой час Народны Камісарыят Земляробства Беларусі разаслаў абежнік па лініі НК Земляробства, які прапануе не перашкаджаць пераходу сялян на хутары.

І гэта ў той самы час, калі мы гаворым усюды, агітуем, заклікаем да калектыўнай апрацоўкі зямлі, да шматпольля, да трактараў.

Вынікам гэтага было тое, што калгасы ў 1926 годзе займалі 2,3 проценты плошчы, а ў 1927 годзе—0,2 процанта.

У Віцебскай акрузе шмат плошчы адведзена пад хутары, прычым зьліквідавана шэраг савгасаў.

Калі ў апошні час пасьля пастаноў партыі аб калектывізацыі вёскі мы маем масавы калгасны рух, калі ў гэты самы час наглядаецца вострая кулацкая барацьба супроць калгасьнікаў, дык у гэты час некаторыя нашы кіраўнікі робяць якраз наадварот: утвараюць саюз з заможнікамі, як гэта мела месца ў Самахвалавіцкім раёне, там загадчык паштовай канторы камсамольцаў і бедняту на працу не бярэ, бо яны, бачыце, „кепскія“ працаўнікі, ня прывыклі да працы; калі ў каго багацейшая гаспадарка, дык той „працаваць будзе лепш“. І давёў гэты загадчык да таго, што камсамолец, які працаваў на пошце, прымушаны быў працу кінуць, а на пошце апынуўся кулак, які нават ня зьбіраў падпіскі на газэты.

У Чабатаўскай спажывецкай каапэрацыі (Гомельская акруга) з млыну муку даюць кулаком, багацеям.

Праўленьне крэдытнага таварыства ў Жыткавіцкім раёне выдала 26 пазык на суму каля 3000 рублёў гаспадаркам, якія маюць ад 6 галоў жывёлы і болей; атрыманыя 32 сэпаратары папалі часткай кулаком, прычым ніводзін сэпаратар не дастаўся арцелям гэтага раёну.

У маі гэтага году, у вёсцы Альхоўка, Уваравіцкага раёну (Гомельшчына), скідку на падатак сельсавет зрабіў заможным, а беднякам скідкі не зрабілі. У вёсцы В.-Крушынаўка, Рагачэўскага раёну, уся плошча Ціхінскага лясьніцтва, адданая пад распашку, трапіла падкулачнікам. Гэты сельсавет дадумаўся нават да таго, што выдаў гэтым падкулачнікам пасьведчаньні аб „беднасьці“. Бывае так, што зусім ня цікавяцца, каму даюць плошчу—беднякам, ці заможнікам. Для гэтых кіраўнікоў няма клясавай розьніцы; ім усё роўна—бяднік ты, ці не.

У Чачэвіцкім раёне камуніст Савіцкі праводзіць разьдзяленьне хутару свайго цесьця, каб вызваліць яго ад падатку.

Калі Савіцкаму даручылі арганізаваць калгас, ён у прыватнай гутарцы з сялянамі сказаў, што арганізаваць калгас няма дзе, і што ён туды не запісваецца. Калі праводзілі самаабкладаньне, ён абклаў тых гаспадароў, якія атрымліваюць дапамогу ад РКСТУ.

Мы дагэтуль яшчэ такіх партыйцаў мала караем, ці зусім не караем. А за гэткае скрыўленьне клясавай партыйнай лініі трэба караць, як за парушэньне, як за нявыкананьне партыйных дырэктыў.

Партыя ставіць задачу ўзьняць сельскую гаспадарку, а ўзьняць яе магчыма толькі на падставе калектывізацыі, шматпольля, увядзеньня сельска-гаспадарчых машын у апрацоўку зямлі. Усё гэта можа зрабіць толькі калектыў. Але ўся бяда правых у тым, што яны гэта ня хочуць прызнаваць.

Правы ўхіл знаходзіцца як-раз на процілеглай партыі пазіцыі. Нарэшце, сутнасьць правага ўхілу зводзіцца да наступнага: як найменш матар'яльных выдаткаў на калгасы і савгасы, ня так сьпяшацца з разгортваньнем кантрактацыі; усё гэта практычныя моманты правага ўхілу ў сельскай гаспадарцы.

Правы ўхіл вядзе да разьвіцьця кулацкіх гаспадарак, „сталыпінскіх“ хутароў.

Наша наступленьне на кулака, на прадстаўніка дапатопнай сыстэмы ў сельскай гаспадарцы выклікае абвастрэньне клясавай барацьбы. І вось знаходзяцца камуністы, якія хочуць весьці барацьбу з кулацтвам толькі ў тэорыі, толькі словамі, а на справе стаяць на абароне чужых нам груп і клясаў.

У Рэчыцкім раёне кулак Нікіценка быў у мінулым годзе зусім мала абкладзены, таму што ў яго заўсёды абедалі і сьнедалі старшыня сельсавету вёскі Новы-Барсук—Кусароў і сэкратар Майсеенка. Тое самае яны зьбіраюцца рабіць і сёлета.

Альбо вось яшчэ адзін факт: старшыня Казімірскага сельсавету (Жлобінскі раён) разьмяркоўваў зямлю запаснага фонду. У канцы атрымалася, што кулаком дасталася зямля з усімі выгодамі: і блізка, і лепшая і большы кавалак. А беднаце засталіся, як кажуць, адны аб'едкі.

У Сваташыцкім лясьніцтве (Аршаншчына) загадчык новапасаджамых дзялянак Тарасэвіч прымаў на працу па пасадцы лесу на плошчы Баеўскага сельсавету выключна кулакоў. Калі прыходзіла бедната, дык ён і гаварыць не хацеў, выганяў вон.

А вось што робіцца ў Полаччыне.

В.-Долецкае крэдытнае таварыства ў мінулым 1928 годзе дало ў крэдыт 192 кгр. супэрфасфату кулаку Рэгіно В., які пазбаўлен права голасу і плаціць каля 300 рублёў падатку.

Хоцімскае таварыства выдала пазыку ў 150 руб. былому пісару, якога судзілі за растрату, які мае батрачку. Выдалі 150 руб. крэдыту Барнаўскаму Міхасю, які трымае 2-х батракоў. Грамадзяніну Абраменка, які мае 25 дзесяцін зямлі, 8 кароў і 3 кані, Хоцімскае таварыства выдала 120 руб. на набыцьцё каня ў той час, як беднякам у крэдыце адмаўляюць.

Дзе тут партыйная лінія? Дзе тут правядзеньне ў жыцьцё пастаноў XVI партыйнай канфэрэнцыі? Тут змагаюцца і ня толькі змагаюцца за правы ўхіл, але на практыцы яго праводзяць.

Не дарма партыя гаворыць, што ўсякае адхіленьне ад партыйнае лініі— ці то будзе „левае“ ці „правае“—усёроўна гэтае адхіленьне вядзе да змазваньня класавай сутнасьці нашай палітыкі, яно вядзе да саюзу з кулацтвам, з клясава нам варожым элемэнтам, і як бы правыя ўхілісты ні адмаўляліся, але факты б'юць у вочы, ад фактаў ніяк не адвернешся.

Але мы яшчэ ня скончылі з фактамі.

Ня гледзячы на тое, што група бедняты была супроць, Глыбачанскае таварыства выдала пазыку на агнятрывалае будаўніцтва кулаку Логвіну ў суме 400 рублёў.

Заскарская малочная арцель пры разьмеркаваньні кармоў выдала 524 кгр. атрубей быламу вядомаму кантрабандысту і гандляру Клепэру, а бедната кармоў не атрымала.

Аб чым сьведчаць усе гэтыя факты, якія мы паказалі вышэй і якіх шмат яшчэ можна прывесьці. Яны гавораць аб многім.

Папершае, аб тым, што многія яшчэ не зразумелі сутнасьці правага ўхілу; падругое, што многія яшчэ не зразумелі партыйнай лініі ў практычнай працы; патрэцяе, яшчэ шмат хто не браўся за вывучэньне пастаноў XVI партканфэрэнцыі; пачацьвертае, што—самае дрэннае ў гэтым пытаньні,—некаторыя зразумелі сутнасьць правага ўхілу і куды ён вядзе, але правы ўхіл на практыцы праводзяць.

У пастановах XVI партканфэрэнцыі і пленумаў ЦК партыі не дарма гаворыцца аб тым, што аднача́сова з вывучэньнем ідэалёгічных карэньняў правага ўхілу, растлумачэньня яго антыпартыйнай сутнасьці, неабходна ў той жа час змагацца з усімі праявамі правага ўхілу на практыцы.

Будзе вельмі сур'ёзная небясьпека, калі мы барацьбу з правым ухілам будзем весьці толькі на ідэалёгічнай падставе, толькі на падставе тэарэтычных ведаў. Неабходна шырока разгарнуць барацьбу з правым ухілам у двух напрамках: з аднаго боку супроць правай ідэалёгіі, а з другога боку—супроць правай лініі на практыцы.

Л. Палесс.

НА ШЛЯХОХ БУДАЎНІЦТВА НОВАЙ ШКОЛЫ.

Хімізацыя школ.

У свой час у «Савецкай Беларусі» паведамлялася аб аглядзе выкладаньня хіміі ў навучальных установах г. Менску, якое пачала праводзіць хіміка-навукова-прамысловая сэкцыя ЦС ТДА-Авіяхіму БССР. Зараз ужо магчыма казаць аб выніках агляду. Былі дасьледваны наступныя навучальныя ўстановы: АБВШ, рабфак, прафшколы, тэхнікумы, агульна-асьветныя курсы, дзевяцігодкі, сямігодкі, радавыя і практыкавальна-паказальныя пры пэдтэхнікумах і Пэдфаку БДУ, школы для дарослых узвышанага тыпу і інш. Выявілася, што выкладаньне хіміі знаходзіцца ў цяжкіх умовах. Было знойдзена цэлы шэраг недахопаў, у тым ліку і лёгка выпраўленых, але вельмі няпрыемна. Высьветлілася, напрыклад, што Акрана адпушчаў некаторыя сродкі на абсталяваньне, але даваў крэдыт на такую арганізацыю (кнігарня БДВ), дзе гэтага абсталяваньня няма, за гэтым школы не маглі выкарыстаць свае грошы і набыць належнае абсталяваньне. Загадчыкі некаторых школ бяруць сабе тыя гадзіны, якія павінны былі-б iсьці ў аплату за кіраваньне хім. лябараторыямі выкладчыкамі хіміі. Асабліва дрэнна пастаўлена праца ў тых нав. установах, якія знаходзяцца на самааплаце, як напр., агульна-асьветныя курсы. Высьвятляецца недахоп часу для апрацоўкі праграм актыўнымі мэтадамі, а НКА Беларусі не зварачвае на гэта належнае ўвагі.

Нядаўна адбыўшаяся ўсебеларуская нарада працаўнікоў пэдтэхнікумаў прыняла пастанову аб павялічэньні ліку гадзін для хіміі па 2 гадзіны для ўзмацненьня лябараторных праў, а мэтадкам на гэта не зважае. Недастаткова прапрацованы праграмы; адсутнічае арганізацыя, якая аб'яднала-б выкладчыкаў хіміі для абгаварэньня мэтадычных пытаньняў, бо ў існуючых умовах працы нават добра падрыхтаваныя выкладчыкі—дэкваліфікуюцца. Мала зьвернута ўвагі ў школах на ваенную хімію, дрэнныя падручнікі, вельмі вялікая нагрузка выкладчыкаў не дае ім прадукцыйна працаваць. Але ўсё-ж адзначаецца некаторы рост, павялічылася цікавасьць да хіміі ў зьвязку з адчыненьнем хіміка-тэхналёг. фак-ту пры БДУ, хімтэхнікуму і г. д. Сэкцыя намеціла цэлы шэраг мерапрыемстваў, якія павінны палепшыць працу. Даручана скласьці на падставе матар'ялаў агляду падрабязную запіску, дзе будуць пералічаны ўсе недахопы і меры, неабходныя да зьніжэньня іх. Трэба толькі каб Наркамасьветы, акрана і інш. адпаведныя арганізацыі ўважліва аднесьліся да гэтай працы, а не адмахваліся ад яе, як гэта бывае часамі зараз.

Бранавіцкі.

На палепшаньне становішча школы сялянскай моладзі.

(Аршанская акруга).

Становішча існуючай у акрузе школы сялянскай моладзі да гэтага часу было нездавальняючым. Як сама школа, так і вучні былі кепска забясьпечаны матар'яльна. Слаба пастаўлена пэдагагічна-выхаваўчая і гаспадарчая праца. Усё гэта патрабавала ўвагі з боку Акрвыканкому і апошні ў сучасны момант прымае цэлы шэраг значных мерапрыемстваў па зьнішчэньню існуючых у школе недахопаў. Акруговаму інспэктарыяту асьветы даручана пры складаньні бюджэту на новы гаспадарчы год прадугледзець мерапрыёмствы па павялічэньню стыпэндый вучням, павялічыць сродкі па навучальнай частцы школы, каб больш паўней забясьпечыць вучняў падручнікамі і распачаць арганізацыю габінэтаў: фізычнага, прыродазнаўчага, агранамічнага і хімічнай лябараторыі, дзеля чаго ў двухтыднёвы тэрмін скласьці прапановы аб першачарговых запатрабаваньнях па арганізацыі габінэтаў. Таксама ў каштарыс будучага гаспадарчага году будзе ўнесена 50.000 руб. на пабудову кляснага будынку з памяшканьнямі для дапаможных устаноў і халодных будынкаў.

Акрза, калгассаюзу, інспэктарыяту Асьветы разам з АК ЛКСМБ запрапанавана кожны год разьмяркоўваць скончыўшых школу на працу ў калгасах, саўгасах і сельска-гаспадарчых таварыствах і арганізаваць летнюю практыку.

Калгассаюзу даручана прадаставіць школе ў арэнднае карыстаньне тыя будынкі калгасаў, якія ня вельмі патрэбны для калгасаў, і падыйдуць больш менш да школы. Таксама калгассаюз сумесна з адміністрацыяй школы павінны дагаварыцца адносна абслугоўваньня вучнямі школы-калгасу, які там існуе.

Зварачваецца ўвага на пастаноўку сталай работы па інтэрнацыянальнаму, антырэлігійнаму і здароваму выхаваньню, а таксама і на пашырэньне грамадзкай працы сярод акаляючага насельніцтва.

Усе гэтыя мерапрыемствы дадуць магчымасьць школе добра паставіць пэдагагічна-выхаваўчую і гаспадарчую працу, значна палепшыць яе і вучняў матар'яльнае становішча, а разам з гэтым дадуць с.-г. каапэрацыі, калгасам і саўгасам добрых працаўнікоў. **А.**

„Культурны асяродак“.

(Завячэльская сямігодка, Полацкай акругі).

Шмат мы гаварылі, што раёнавая сямігодка павінна зьяўляцца культурным асяродкам раёну. Але гэта не заўсёды бывае так. Возьмем для прыкладу Завячэльскую сямігодку, Вушацкага раёну. Ці можа быць такая школа культурным асяродкам? Не, ня можа быць, бо няма выхаваўчай працы, няма разумнай здаровай дысцыпліны, як з боку адміністрацыі школьнага самакіраваньня, так з боку камсамольскай ячэйкі.

У працягу ўсёй зімы вучні хадзілі піць ваду да студні, у выніку чаго хварэла шмат вучняў.

Вучні сямігодкі ня былі прыкладам для вясковай моладзі.

З пачатку навучальнага году амаль што да зімовых вакацый можна было бачыць толькі баляваньні і скокі да двух-трох гадзін ночы, а вучоба адкладвалася надалей.

Усё гэта прывяло вучняў да распусты; курэньня, п'янства, і нават ухажваньня за дзяўчатамі... Вучні сыстэматычна пачалі адставаць у вучобе.

2-гі выпуск Завячэльскай сямігодкі меў толькі 10 вучняў; сярод вучняў было вялікае абурэньне супроць настаўнікаў.

Належным установам неабходна зьвярнуць на гэта ўвагу і прыняць тэрміновыя меры. **Бачыўшы.**

Вынікі працы па ўсеагульнаму навучанню ў 1928-29 навуч. г.

1928-29 год зьяўляецца чацьвертым годам плянавай працы ў БССР па ажыцьцяўленьню ўсеагульнага навучаньня.

Лік новых школьных камплектаў у гэтым годзе павялічыўся на 412, прычым агульны лік школьных камплектаў складае 9575, у якіх вучылася 434.512 вучняў.

За час існаваньня Савецкай Беларусі процант ахопу пачатковай школай дзяцей школьнага ўзросту павялічыўся, у параўнаньні з дарэвалюцыйным, з 40 да 74 проц.; такім чынам, за кароткі час існаваньня БССР зроблена ў справе ахопу школай дзяцей больш паловы таго, што было зроблена пры царскай уладзе за некалькі стагодзьдзяў.

Новыя школьныя камплекты адчыняюцца, галоўным чынам, у вясковых мясцовасьцях; з 412 камплектаў, якія адчыніліся ў 1928-29 годзе, толькі 6 камплектаў адчынена ў гарадох, астатнія 406 камплектаў адчыніліся ў раёнах.

Амаль палова ўсіх адчыненых камплектаў (213 з 412) пашла на адчыненьне новых аднакамплектавых школ (з 1-м настаўнікам).

Лік аднакамплэктавых школ складае яшчэ 63,5 проц. агульнага ліку школ і зьмяншаецца вельмі павольна. Тлумачыцца гэтае тым, што школьны радыус яшчэ досыць значны, і насельніцтва імкнецца адчыняць школы ў сваіх вёсках, каб бліжэй было хадзіць у іх дзецям.

Нязначна зьмяншаецца і нагрузка настаўніка: у мінулым годзе на аднаго настаўніка прыходзілася, у сярэднім 45,9 вучня, у бягучым годзе на 1 камплект прыпадае 45,5 вучняў. Тлумачыцца гэтае тым, што наплыў дзяцей у школы у апошнія гады зьяўляецца надзвычайна вялікім.

Нацыянальны прынцып у правядзеньні ўсеагульнага навучаньня праводзіцца няўхільна [illegible] 26 яўрэйскіх школьных камплектаў, 8 польскіх, 8 расейскіх, 1 латышскі, 1 літоўскі, 1 беларуска-польскі.

У гэтым годзе было больш зьвернута ўвагі на адчыненьне школ у саўгасах і калгасах [illegible] адчынена у саўгасах і калгасах 15 новых школьных камплектаў.

[illegible] ...185 дзён. [illegible]

Справа школьнага будаўніцтва ідзе досыць павольна. [illegible]

[illegible]

Зьм. Сьцяпура.

Увага другарадным дысцыплінам.

Становішча, так званых «другарадных» прадметаў у нашых сямігодках павінна зьвярнуць да сябе больш увагі з боку кіруючых асьветных устаноў. Да такіх „другарадных“ (гэта значыць загнаным) дысцыплін адносяцца: нямецкая мова, маляваньне, або графіка (завуць нават і «мастацтвам»), сьпевы, фізвыхаваньне і ручная праца.

У якім-жа стане знаходзяцца гэтыя дысцыпліны? Летась у нашай сямігодцы выкладала нямецкую мову старалюдная, разьбітая ўсімі хваробамі старушка, веды якой у нямецкай мове былі цьвёрда абмежаваны рамкамі даваеннай прагімназіі, а пэдагагічныя здольнасьці і падыход да вучняў яскрава характарызаваліся наступнымі аўтографамі ў клясным журнале: „заняткаў ня было з прычыны вялікага шуму ў клясе“.

Другі прыклад. Адзін мой сябра па унівэрсытэту расказваў, як яго на школьнай радзе прымушалі і прымусілі выкладаць фізвых: „у вас“, кажуць, „хоць няма падрыхтоўкі да фізвыху, затое-ж у вас выхадка якраз, як у вайсковага, а ў нас кажуць, і гэтага няма“. Нічога ня зробіш, узяўся мой сябра за фізвых, маршыраваў, ды бегаў увесь год з вучнямі па школьным двары.

А чым зьяўляецца ручная праца ў сямігодках? Яна была зьведзена... к капаньню—канаў наўкол школы, а выпаў сьнег і гэтая праца спынілася.

Мастацтва, або графіка ў кожнай школе набывае свой асаблівы «колёрыт». У адных школах мастацтва ёсьць графіка—«бясплатны дадатак» да матэматыкі, у другіх гэта тэорыя маляваньня, у трэціх проста маляваньне ўсяго, што пад руку падаткнецца

Чаму такое багацьце „калёрытаў“, „адценьняў“ [illegible]

[illegible] узялі-б вы нямецкую мову? А маляваньне? Ды кіньце, кветкі маляваць умееце? Ну, вось бачыце, вам і карты ў рукі! Прыпёрты з двух бакоў (13 гадзін з аднаго боку і націск школьнай рады з другога) прыродавед бярэцца „за знаёмую працу.

Такім спосабам паступова большасьць „другарадных“ прадметаў „рассасваецца“, але бывае і застаецца.

[illegible]

На тыя-ж прадметы, якія ў праграме БДУ маюцца (нямецкая мова) трэба зьвярнуць больш увагі.

У выпадку недахопу выкладчыкаў для той ці іншай дысцыпліны, стала вызначыць якія прадметы ў першую чаргу павінны паглыбляцца за кошт аслабаніўшыхся гадзін.

4—скі.

Тэрор супроць настаўніцтва ў Пірэвічах.

Пачалося гэта пытаньне ў мінулым годзе, а 20-VI-29 г. раніцою была зроблена расправа над загадчыкам Пірэвіцкай сямігоўкі Жлобінскага раёну тав. Кузьняцовым з боку выключанага вучня—хулігана Усянкава.

Пры службовых абавязках Кузьняцова ў канцэлярыі сямігодкі Усянкаў зрабіў замах на забойства Кузьняцова пры падпісаньні загадчыкам Усянкаву даведкі аб выбыцьці яго са школы (Усянкаву 18 год). Кузьняцоў паранены ў руку. Куля была з абрэзаным канцом, каб ніякага ня было ратунку. Але Кузьняцоў пасьпеў схапіцца і адвесьці накіраваньне дула ад грудзей. Куля папала ў левую руку.

Высьвятляецца, што ў гэты самы дзень дула бандыта і яго прысьпешнікаў падрыхтоўвалася і супроць другіх настаўнікаў.

Праяўленьне бандытызму Усянкава было яшчэ ў мінулым годзе.

Усе бандыцкія ўчынкі Усянкава цяжка пералічыць.

А яшчэ раней Усянкаў пахваляўся, што ён застрэліць 11 чалавек, што яму турма ня страшна, турма для яго—дом адпачынку.

Шырокая грамадзкасьць павінна асудзіць бандыцкі ўчынак і запатрабаваць судовага пакараньня. Гэта пазбавіць працаўнікоў ад гэткага тэрору і злачынства.

Т-аў і Н-кі.

„Перчатки“, настаўнікі і Драп.

„Перчатки“—ісподкі, рукавіцы. Настаўнікі—выхавацелі трэцяга пакаленьня, салдаты трэцяга фронту. Драп, —ня той, што шыюць з яго паліто, ня той, што выпушчаюць фабрыкі на здавальненьне таварнага голаду, зусім ня той, якім мы прывыклі бачыць адрэз матэрыі ў два-тры мэтры даўжынёй,—Драп самы сапраўдны, з вялікай літары, жывы, шчасьлівы пасвойму, заўсёды з плянамі, загадамі, дырэктывамі; Драп—Мазырскі гарадзкі інспэктар асьветы; Драп тып—аповесьць пішы з натуры; Драп няшчасьце мазырскіх настаўнікаў.

Сёньня можна зайсьці ў ЦРК і купіць „перчатки“. Заўтра, калі яны не спадабаюцца можна надзець другія, можна пакласьці ў скрынку „архіву“, аддаць каму-небудзь у падарунак або проста зьнішчыць, сьцерці з твару зямлі. Сёньня можна ўзяць настаўніка на работу, а заўтра (абавязкова заўтра? а калі праз месяц, паўгода, год?) перакінуць яго ў другую школу, альбо проста зусім пакінуць бяз школы. Няхай настаўнік даказвае, што такое перакідваньне дрэнна адбіваецца на прадукцыйнасьці працы, што гэта зусім ня ўвязваецца з пэдагагічнымі законамі (а мо' і няма ніякіх „законаў“, мо' гэта міраж, ільлюзія?), няхай настаўнікі пратэстуюць усім сваім калектывам разам з прафарганізацыямі супроць такой пастаноўкі працы, няхай яны патрабуюць нешта падобнае і да звальненьня Драпа з пасады гарадзкога інспэктара асьветы, няхай! Драп досыць эгаістычная індывідуальнасьць і самабытная, грубая па мазырскаму, натура.

— Скажэце прычыну звальненьня? —запытвае загадчык 2-й 7-годкі.

— Растлумачце, калі ласка, неабходнасьць перакідваньня мяне ў другое месца?—чакае адказу загадчык 4-й 7-годкі.

— Паведаміце, таварыш інспэктар, аб мэтазгоднасьці пераводу мяне ў іншую школу?—Глядзіць на інспэктара загадчык школы павышанага тыпу.

Ні прычыны, ні неабходнасьці, ні мэтазгоднасьці ня скажа, не растлумачыць і не паведаміць Драп. Ён спакойным тонам адкажа («Вус не поведет, и око не моргнет, и губа не дрогнет»):

— Прычына ў мяне не готова,— прыдзеце праз два дні.

Звальненьне авансам! Сёньня звольніў, а праз два дні—„калі ласка, пожалуйста“—і прычыну вам за належным нумарам, датай, штампам, пячаткай і подпісам. Атрымайце і супакойцеся. Слухайце і падначальвайцеся.

Такая мазырская сапраўднасьць, такое мазырскае няшчасьце настаўніцкае, аблітае... Не, не, не аблітае, а пераказанае ўсім і ўсякаму, нават і Мазырскаму гарсавету, на які былі ўскладзены ўся вера, любоў і надзеі. І гарсавет дапамог: гарсавет адмяніў драпаўскую пастанову і вынес аўтару яе папярэджаньне.

Усё-такі настаўнікі ў непакоі. Летні адпачынак праходзіць трывожна. Нэрвовы настрой падказвае, што дзесьці, хтосьці, штосьці падрыхтоўвае, гэта „штосьці“ патрэбна да гарматы альбо дынаміту, якія сакрэтным парадкам— няпрыкмеціш, не заўважыш—закопваюць пад кватэры салдатаў трэцяга фронту. Закапаюць, замуруюць, а потым запаляць фіціль—і выбух страшэнны і нямінучы, раскажа аб трагэдыі жыцьця настаўніка.

І ня толькі ў Мазыры так. 5 іншых мясцоў ёсьць прыблізна такія-ж весткі. Трохкутнік—„Перчаткі—Настаўнікі і Драп“.—дзейнічае, праўда. не з Драпамі з вялікай літары (якая ў гэтым розьніца?), праўда, у другой форме, з другімі мэтадамі і тактыкай, праўда, ня ўсюды з такім шчасьлівым канчаткам, як у Мазыры. Падложаны пад казармы салдатаў трэцяга фронту дынаміт трэба перанесьці, не сакрэтным парадкам, пад габінэты драп'аў з малой літары.

Цім. Зарэчны.

Хата-чытальня павінна стаць сапраўды масавым культурна-асьветным асяродкам у вёсцы.

Зараз у мовах клясавае барацьбы вясковыя бядняцка-серадняцкія масы вядуць распрацоўку пяцігадовага пляну разьвіцьця сельскае гаспадаркі, задач калгаснага каапэрацыйнага будаўніцтва, уздыму ўраджайнасьці і надыходзячай васеньняй пасеўкампаніі. Посьпехі вырашэньня гэтых пытаньняў патрабуюцца і ад хаты-чытальні, як ад асьветнага асяродку ў вёсцы.

Да гэтага часу хаты-чытальні стаяць не на тэй вышыні, якую патрабуе жыцьцё. У сваёй большасьці хаты-чытальні—мёртвыя пункты. Усё гэта тлумачыцца слабым падборам кваліфікаваных хатнікаў і іх дрэнным матар'яльным забясьпечаньнем.

Значную ролю, а мо' й галоўную ў працы хат-чытальняў грае літаратура, якая адпавядае сялянскім запатрабаваньням, а яна часта адсутнічае, не гаворачы ўжо аб кіно-перасоўках і радыё.

Самыя мэтады масавае працы ў хатах-чытальнях вельмі простыя. Праца зводзіцца галоўным чынам к сухім дакладам, гутаркам і даведкам у якіх няма відавочнасьці. Салянства будзе цікавіцца гэтаю працаю тады, калі будзе для яго відавочны паказчык. Яно на слова ня верыць, яму трэба паказаць усё на прыкладзе.

Хата-чытальня павінна быць у вёсцы першым застрэльшчыкам ажыцьцяўленьня задач зьвязаных з уздымам сельскае гаспадаркі і яе сацыялістычнай перабудовай.

Гэта будзе дасягнена толькі тады, калі хата-чытальня будзе праводзіць сваю працу на жыцьці мясцовых камун. калгасаў і саўгасаў. Патрэбна ўтвараць масавыя экскурсіі туды, дзе будуецца новая сацыялістычная гаспадарка, каб на жывых прыкладах вучыць масы сацыялістычнаму будаўніцтву.

П. Снокаў.

В. СТАШЭЎСКІ.

МАГУТНЫ ФРОНТ.

(Пра кніжны рух на Украіне).

Украінская кніжная вітрына буйнейшых культурных цэнтраў Украіны робіць на падарожніка вялікае ўражаньне. І ня дзіва, што ў артыкулах аб Украіне, якія зьмяшчаліся на старонках нашых газэт і часопісаў, мы заўсёды сустракалі цёплыя, лірычныя словы, адрасаваныя гэтым вітрынам.

Дамо нашаму чытачу некалькі характэрных рысак, па якіх ён мог бы ўявіць вялічэзны кніжны рух на Украіне—рух апошняга дзесяцігодзьдзя, савецкі рух.

Пачаткам адраджэньня украінскае літаратуры і новага друкаванага слова лічыцца 1798 год, калі выйшла ў сьвет „Энеіда“ Ів. Котляревського. З гэтага часу да 1841 году выдана 44 кніжкі. Прычым, 27 з іх выдана ў Расеі. З 1841 г. да 1905 г. выйшла 1250 кніжак. З 1905 году пачынаюць зьяўляцца першыя агітацыйныя эсэраўскія і сац-дэмакратычныя кніжкі. 1913 і 1914 гады былі найбольш ураджайнымі. Імпэрыялістычная вайна значна прыпыніла выданьне. Аднак, 1915 год даў 73 назвы і 1916 г.—76. Агульны-ж лік кніжак з 1905 па 1917 год складае лічбу 1920. 1917—1918 гады адразу даюць 1931 назву, а гэта ўжо складае каля 70 проц. усяго кніжнага тыражу. У гэты час існуе 98 розных украінскіх выдавецтваў. У 1919 годзе ў Харкаве засноўваецца Савецкае Цэнтральнае агенцтва па распаўсюджаньню друку, якое і зьяўляецца папярэднікам цяпер існуючага Дзяржаўнага Выдавецтва Украіны. 5 мая 1919 году выходзіць дэкрэт аб утварэньні Усеукраінскага Дзяржаўнага Выдавецтва.

Як бачым, Дзяржаўнае Выдавецтва Украіны і украінская савецкая кніга мае ўжо дзесяцігадовую гісторыю свайго існаваньня. Гэты юбілей адзначан грандыёзным месячнікам украінскае кнігі. Ён прыцягнуў надзвычайна вялікую ўвагу савецкага грамадзтва. Усе выдавецтвы Украіны рыхтаваліся да гэтага месячніка, але не сьвяточная парадпасьць была ў аснове гэтага юбілею, а вялічэзная, напружаная праца над пашырэньнем украінскае культуры і прасоўваньнем у масы украінскае кнігі. Праўду кажучы, гэтая праца праводзіцца на Украіне ня толькі кампанейскі, у сувязі з юбілеем—яна вядзецца сыстэматычна, з кожным годам набываючы ўсё большы размах. Гэтая вялікая культурная праца паступова захапляе буйнейшыя індустрыяльныя цэнтры Украіны. За украінскую пралетарскую культуру рабочыя масы ўзяліся сур'ёзна. Аўтар гэтых радкоў яшчэ прошлага лета меў выпадак прысутнічаць на вечарох украінскае культуры рабочых Дніпропетровську і Запоріжжя. Паездку украінскіх пісьменьнікаў і літаратараў арганізаваў тагды саюз мэталістых Рабочая аудыторыя з вялікаю ўвагаю слухала жывое мастацкае слова. У Дніпропетровську рабочыя, прывітаўшы сваіх пісьменьнікаў, перадалі ім адрас—наказ. З бадзёрым настроем пакінулі пісьменьнікі гэтую аудыторыю. Яны абяцалі ўважна слухаць мэталічны звон Дніпропетровську. Фактычна яны пакінулі сьцэны клюбу, а з аудыторыяй—масамі яны наладзілі жывую сувязь.

У выніку такіх паездак і спатканьняў пісьменьнікаў з чытачамі вельмі шпарка пачала разыходзіцца украінская кніжка. Яна трапіла ў рукі рабочага чытача, таго чытача, які вельмі патрэбен у справе разьвіцьця украінскай пралетарскай культуры. Украінскія выдавецтвы бядуюць, што ня могуць задаволіць запатрабаваньняў свайго спажыўца. «Особлива зараз ми є свідками й учасниками величезного руху робітничих мас за опанування української культури, що має за свій визв нічуваний досі попит на українську книжку—художню, масову політичну і інш. Зріст книжкової продукци явно відстає від цього зросту попиту“*).

Прывядзём лічбы кніжнае прадукцыі ДВУ за мінулы час, а таксама некаторыя з пяцігадовага пляну:

1920-21 год дае назваў 195, друкаваных артыкулаў—336; 1925-26 г.—882 назвы і 5373 друк. аркушаў; 1927-28 г.—1066 назваў і 6529 аркушаў; 1929-30 г.—3250 назваў і 20840 аркушаў; 1932-33 г.—4155 назваў і 28840 аркушаў.

Гэтыя лічбы выразна паказваюць на вялічэзны размах буйнейшае кніжнае фабрыкі на Укріне—ДВУ.

Вялікую ўвагу ДВУ аддае пэрыядычным выданьням. Яно выдае і распаўсюджвае літаратурна-мастацкія часопісі розных літаратурных аб'яднаньняў. У 1928-29 годзе выдаецца 34 розныя часопісі, з агульным тыражом 7527000 экз., ці 2617 друкав. аркушаў. Цікавай зьяўляецца агульная лічба ўсіх часопісаў, якія выдаюцца на Украіне.

У хроніцы нашай часопісі „Полымя“ за май месяц мы знаходзім, што ў УССР выдаецца 165 часопісаў. Сапраўды-ж на Украіне ў 1928 годзе выходзіла 233 часопісі на украінскай мове; апрача гэтага выходзілі яшчэ і на іншых мовах—на расейскай мове таксама салідная лічба—76.

Мы сказалі, што буйнейшай кніжнай фабрыкай зьяўляецца ДВУ. Аднак, прадукцыя гэтай буйнейшай фабрыкі складае на украінскім кніжным рынку толькі 50 проц. Другую палавіну даюць розныя каапэрацыйныя выдавецтвы. Дзейнасьць і вопыт гэтых выдавецтваў зьяўляецца вельмі цікавымі для нас, і калі мы ў нас, на Беларусі, пойдзэм па шляху пашырэньня выдавецкае справы, нам неабходна будзе скарыстаць іх дасягненьні.

Віднейшае месца пасьля ДВУ займаюць: харкаўскае выдавецтва «Пролетарий», якое у 1928 г. дало 2664 друкав. аркушы. Далей—каапэрацыйнае выдавецтва „Книгоспілка“—637 назваў—1874 друкав. аркушы. Выдавецтва „Український Робітник“—862. „Наукова Думка“—798 арк. Сельскагаспадарчае выдавецтва «Радянський Селянин»—769 арк. Нацменаўскае выдавецтва «Центровидав»—512 і шэраг іншых, ня кажучы пра невялікія (ва ўмовах Украіны) выдавецтвы як „Рух“ і «Плужанин», якія выдаюць выключна мастацкую літаратуру; шэраг іншых выдавецтваў таксама вялікую ўвагу аддаюць мастацкай літаратуры. Узяць-бы „Книгоспілку“. З 1874 друкаваных аркушаў 600 аркушаў пашло на мастацкую літаратуру. На каапэрацыйную, напрыклад—553 аркушы, на падручнікі і пэдагагічную—477 арк. і далей ідзе зьмяншэньне на іншыя.

Маючы такія гіганцкія кніжныя фабрыкі, як ДВУ, „Книгоспілку“, здаецца, павінна была-б адпасьці патрэба ў дробных выдавецтвах. Аднак, на Украіне мы налічваем іх звыш дзесятка. Чым гэта тлумачыцца? Гэта тлумачыцца ўмовамі паліграфічнае прамысловасьці, багатаю разнастайнасьцю выдавецкае справы і, нарэшце, (а гэта мо' і галоўнае) тым, што пры наліччы некалькіх выдавецтваў ёсьць пэўнае спаборніцтва ў выдавецкай справе.

Вядома, што наліччa дробных выдавецтваў не—ідэал, аднак, на сёньнешні дзень яны цалкам апраўданы.

Узяць, напрыклад, невялічкае каапэрацыйнае выдавецтва «Рух». Яго мэта: **„сприяти розвиткові соціялістичних елементів української культури“** (са статуту § 1). Гэтае выдавецтва з невялічкімі паявымі ўзносамі—2 р. 50 к. пачало сваё існаваньне з 1921 году. Бяз усякае грашовае дапамогі са сваімі невялічкімі сродкамі яно к 1928 году выпусьціла 317 назваў—1379 друк. аркушаў. Яно выпускае цэлыя бібліатэчкі. Скажам: „бібліотеку українознавства“ «театральну бібліотеку“, якая складаецца з 50 п'ес, бібліатэку гістарычных апавесьцяй і раманаў, дзіцячую літаратуру і асабліва шырока разгорнена выданьне твораў клясыкаў. Так, напрыклад, ім выданы поўны збор твораў Ів. Франка—36 томаў, а таксама бібліатэчка невялічкіх кніжачак гэтага-ж аўтара пад назваю «Франківська бібліотека»; у яе ўваходзяць 30 кніжачак коштам 10—20 кап. Выдан поўны збор твораў Б. Грінченко—10 томаў і „Грінченківська бібліотека»—16 кніжачак; О. Кобилянськоі—10 томаў, В. Вінниченко—23 томы, Миколи Чернявського—10 томаў, Гн. Хоткевіча—6 томаў. Поўны збор твораў Тараса Шевченко і шэраг твораў сучасных маладых пісьменьнікаў.

З гутаркі з членамі праўленьня гэтага выдавецтва я заўважыў, што гэтыя людзі з вялікім замілаваньнем вядуць такую культурную працу. Пачаўшы сваю працу з 345 паявых рублёў, гэта выдавецтва за параўнальна кароткі час узмацнілася настолькі, што цяпер сапраўды можа «сприяти розьвиткові соціялістичних елементів української культури».

Кніжны рух на Украіне з кожным годам набывае ўсё большыя і большыя памеры. Гэта вялічэзны культурны рух. Ён нястрымна будзе ісьці, гэта—частка вялікага сацыялістычнага руху.

* * *

У заключэньне паразважаем крыху наконт кніжнага руху ў нас, на Беларусі. Тут, нам думаецца, прыблізна тыя-ж самыя працэсы паступовага ўзросту і пашырэньня, вядома адпаведна з нашымі ўмовамі. Была адзін час пашырана думка, што Беларусь зьяўляецца найбольш выразным паказчыкам таго, як ва ўмовах савецкае ўлады ўзрасло друкаванае слова раней прыгнечанае нацыі. Так, дарэвалюцыйная спадчына ў нас невялікая. Але і гэтая спадчына ў сваёй большасьці цалкам прыемлема і ў сёнешнія нашы дні. Таму мы бачым яе ў выданьнях нашага БДВ, таму яна займае пачэснае месца ў вітрынах нашых кнігарняў. Маленькія вітрыны 8—10 гадоў таму назад увачавідкі разрастаюцца з кожным годам. І ўсё гэта кнігі, якія ў абсалютнай большасьці зьявіліся ў нашу рэвалюцыйную эпоху. Усё гэта цалкам прадукцыя БДВ. Здаецца, цяжка будзе знайсьці 2—5 кніжак дарэвалюцыйнага выданьня. Такім чынам, мы маем буйны росквіт беларускага друкаванага слова, а таксама друкаванага слова ўсіх нацыянальнасьцяй, якія насяляюць Савецкую Беларусь. Дасягненьні Савецкае Беларусі ў кніжнай справе відавочны ня толькі кожнаму з нас, ня толькі Савецкаму Саюзу, а і тым замежным краінам, якія хоць крыху расплюшчылі вочы і па людзку глянулі на нашу рэчаістасьць.

Але, працуючы над стварэньнем і распаўсюджаньнем нашае савецкае кнігі, мы павінны быць вельмі ўважнымі да ўсіх памылак, якія нямінучы ў такой новай для нас справе. А памылкі могуць ісьці, пачынаючы ад пяра пісьменьніка і канчаючы прадаўцом у кніжнай краме. Нам думаецца, што ў нашых беларускіх умовах найбольш памылак прыпадае, як-бы сказаць, на сярэднюю інстанцыю—на выдавецтва.

Тут часта мы знойдзем і бязграматную рэдакцыю, часам даволі „шаткую“ стылізацыю, «далікатныя ганарарныя абыходжаньні“, двухгадовае, рукапіснае вандраваньне і проста „казёньненькае спакойства“ і інш. Усё гэта ў пэўнай дозе ёсьць і аб гэтым трэба своечасова гаварыць, гэта трэба своечасова выправіць. Было-б дзіка, калі-б мы толькі хвалілі сябе. Белдзяржвыдавецтва часта лаялі і часта зусім заслужана, а часам і незаслужана. Ёсьць-жа моманты, калі БДВ і фізычна і тэхнічна ня можа выканаць тэй ці іншай работы, а лаюць таму, што яно ўзялося выканаць і ня выканала.

Выдавецтва сёлета зварачалася да многіх пісьменьнікаў з просьбаю даць свае гумарыстычныя і антырэлігійныя творы для выданьня іх невялічкімі кніжачкамі ў 1-2 аркушы. Нам здаецца, што гэта добрае жаданьне канчыцца ня зусім пасьпяхова і не па віне выдавецтва. Справа ў тым, што ня хопіцца-ж пісьменьнік за гэты прапанаваны выдавецтвам „жанр“ так адразу, атрымаўшы паперку. Гэта значыць, некаторым пісьменьнікам трэба пашукаць, выбраць з таго, што ўжо недзе ў часопісях і газэтах надрукована. І вось, калі-б на запытаньне, ці ёсьць на старонках нашае пэрыодыкі гумарыстычныя і сатырычныя творы, мы захацелі адказаць шчыра, дык мы пачулі-б: не, няма, няма. І гэта ў пэрыяд разгортваньня самакрытыкі, чысткі савецкага апарату, партыі. Тут-жа гумарэскі, сатыра, шарж патрэбны, як у засушлівую пару дождж. З газэтнае практыкі мы бачым што ні сатыра, ні шаржы не знайшлі сабе належнага месца. Там, у большасьці, калі чалавек мае перад сабою матарыял аб якім-нібудзь адмоўным зьявішчы нашага жыцьця і каб мацней ударыць па балячках, ён перш за ўсё падбірае самы траскучы загаловак, як, скажам: „Калёным жалезам вычысьцім грязь“ і г. д. Абурыўшыся „на злодзея“, аўтар у канцы артыкулу вылае яго, прыложыць свой псэўданім і пашло. І вось часта, такі здаецца «моцны» артыкул не дасягае тае мэты, якую ставіў аўтар і газэта. У нас ёсьць „дела и люди“, да якіх патрэбен іншы падыход, патрэбна больш тонкае пяро. Гумарыстыка нам неабходна, трэба ствараць умовы для яе разьвіцьця. Зараз пісьменьніку прыходзіцца ўлічваць мажлівасьці надрукаваньня такога твору. Пакуль што іх амаль зусім няма. Нашы часопісі занадта «салідныя», а спэцыяльных, як гэта ёсьць на Украіне, у нас няма. Украінская гумарыстыка стаіць вельмі высока. Такі майстар слова, як Астап Вішня,—вядомы амаль усяму Савецкаму Саюзу. Грамадзкае значэньне яго творчасьці надзвычайна вялікае.

Ня прыходзіцца гаварыць аб тым, што нам патрэбны ілюстраваныя часопісі, у якіх можна было-б зафіксаваць моманты нашага сацыялістычнага будаўніцтва. Наліччa ілюстраванай часопісі выкліча да жыцьця новыя літаратурныя жанры,—нарысы, эцюды, зарысоўкі і г. д.

Цікава, што летам, напрыклад, многія езьдзяць па Беларусі, па абшарах Савецкага Саюзу наогул і за межы. Езьдзяць і пісьменьнікі і навуковыя работнікі і іншыя. У кожнага застаюцца пэўныя ўражаньні, аднак, зарысовак гэтых уражаньняў, як бы фоталітаратурных здымкаў у нашай прэсе мы сустракаем вельмі мала. Тут відавочная патрэба мець адпаведныя часопісі

Прыводзячы некаторае параўнаньне нашага кніжнага руху з украінскім, трэба сказаць, што наш кніжны рух мае некалькі аднабокі характар. Мы маем нахіл як-бы сказаць у бок «кніжнасьці». У нас няма самых неабходных часопісаў, няма тэй разнастайнасьці, якая ёсьць на Украіне.

*) Анд. Річицький—„Десять років“. Бюлетень ДВУ № 4-5.

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ УРАДУ БССР

Пастанова Эканамічнай Нарады пры Савеце Народных Камісараў БССР

ПРА КАПІТАЛЬНАЕ БУДАЎНІЦТВА ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ І ПАДРЫХТОЎКУ ДА БУДАЎНІЧАГА СЭЗОНУ 1929-30 г.

(Па дакладу НК РСІ).

I.

Канстатаваць, што па капітальнаму будаўніцтву ў прамысловасьці акрамя адзначаных ранейшымі пастановамі Эканамічнай Нарады маюцца наступныя недахопы:

а) Зацяжка ў праэктаваньні праэктуючымі органамі.

б) Недастатковая добраякасьць праэктаў, з прычыны чаго на практыцы прыходзілася пераапрацоўваць тыя ці іншыя часткі гэтых праэктаў у працэсе самага будаўніцтва.

в) Частыя зьмены праэктных заданьняў, выклікаемыя зьменамі разьмераў будаўніцтва, несваечасовым выбарам вучастку для будуючагася аб'екту.

г) Зацяжка ў праходжаньні пляну капітальных работ праз адпаведныя органы.

д) Каштарысы паасобных аб'ектаў будаўніцтва ў шэрагу выпадкаў былі не дакладны да моманту прыступу да будаўніцтва, у выніку чаго мелі мейсца нямінучыя перавыдаткі.

е) Адсутнасьць цьвёрдых каляндарных апэрацыйных плянаў у трэстах і Белдзяржбудзе, што зьяўляецца перашкодай да эканомнага і рацыянальнага вядзеньня ўсяго будаўніцтва; маюцца няўвязкі паміж паасобнымі пэрыядамі ў будаўніцтве і заказамі на абсталяваньне.

ж) У самім працэсе будаўніцтва мелі мейсца:

1) Выпадкі нізкай якасьці будаўнічых матар'ялаў (кепская афармоўка цэглы, сыры лес) і нядбайных адносін пры скарыстаньні іх.

2) Недастатковае прымяненьне або адсутнасьць мэханізацыі на будаўніцтве, адсутнасьць агульнай рацыяналізацыі працы.

3) Недастатковае рацыянальнае скарыстаньне рабочай сілы, выкананьне работ рабочымі не адпаведнай кваліфікацыі.

4) Нерацыянальнае скарыстаньне рабо- [illegible]

[illegible]

чаньня нармальнага снабжэньня асноўным запраэктаваным абсталяваньнем.

6. Улічваючы, што новае прамысловае будаўніцтва рэспублікі ў значнай ступені базіруецца на пераапрацоўцы прадукцыі сельскай гаспадаркі—лічыць неабходным узмацніць увагу па пытаньнях якаснага палепшаньня і колькаснага павялічэньня адпаведных тэхнічных культур, дзеля чаго:

а) прапанаваць ВСНГ сумесна з НКЗ і адпаведнымі трэстамі паставіць як адзін з асноўных момантаў сваёй плянавай і апэрацыйнай працы, прыняць належныя меры да падрыхтоўкі патэнцыяльнай сыравіннай базы для новага будаўніцтва, каб у момант пуску яго ў эксплёатацыю быць забясьпечаным ад магчымых перапынкаў у працы (бульба, ільнанасеньне, лён і інш.);

б) прапанаваць НКЗ, ВСНГ і Дасьледчаму Інстытуту імя Леніна да 1-га верасьня 1920 г. распрацаваць пытаньне аб мерапрыемствах агратэхнічнага і агракультурнага характару, накіраваных да пашырэньня сыравіннай базы па тэхнічных культурах у раёнах распалажэньня існуючых крахмальных, броварных, маслабойных і інш. заводаў і ў раёнах пабудовы апошніх па пэрспэктыўнаму 5-цігадоваму пляну прамысловасьці;

в) адначасова прапанаваць НКЗ і Бельсельтрэсту да 1-га жніўня пераглядзець вытворчы плян саўгасаў і іх севазварот у мэтах іх прыстасаваньня да асноўнай задачы падрыхтоўкі сыравіннай базы для прамысловасьці;

г) прапанаваць ЦСУ з удзелам ВСНГ неадкладна арганізаваць працу па ўдакладненьню таварнасьці і складаньню балянсаў тэхнічных культур па рэспубліцы.

7. У мэтах найбольш рацыянальнага правядзеньня будаўнічых работ і зьнішчэньня недахопаў, меўшых мейсца ў мінулым—прапанаваць:

а) сваечасова не пазьней студзеня за- [illegible]

[illegible]

Саюзу далёка адлеглых ад БССР;

б) прапанаваць Мэталётрэсту да 1-га жніўня праверыць з заказчыкамі рэальнасьці тэрмінаў, выкананьня заключаных дагавораў і ўстанавіць па згодзе з апошнімі канчатковыя і цьвёрдыя тэрміны паставак у адпаведнасьці да сваіх фактычных вытворчых магчымасьцяў;

в) у мэтах узмацненьня дагаворнай дысцыпліны па прынятых на сябе абавязательствах па пастаўцы абсталяваньня, абавязкова ўключаць у дагаворы абавязнасьць уплаты няўстойкі за несваечасовае выкананьне дагавору як цалкам, так і ў часьці.

г) для падняцьця якасьці пастаўляемага абсталяваньня з боку заводаў Саюзу і інш. савецкіх рэспублік прапанаваць ВСНГ падняць гэта пытаньне перад ВСНГ СССР, для палепшаньня-ж прадукцыі Мэталётрэсту—узмацніць штат канструктараў і ўвесьці тэхнічны нагляд над яго вытворчасьцю і, як правіла, кантроль і папярэднюю (да выпуску з заводу) праверку адпаведнасьці выкананых заказаў тэхнічным умовам заказу, апроч таго выпускаемае абсталяваньне ці часткі яго павінны быць абавязкова снабжаны адпаведнымі сэртыфікатамі-пашпартамі з паказаньнем канструкцыі, разьмеру паасобных частак і іншых тэхнічных паказальнікаў, якія цалкам характарызуюць данае абсталяваньне.

14) Прасіць НКГандлю СССР абавязаць замежныя гандлёвыя прадстаўніцтвы сваечасова разьмяшчаць заказы на імпартнае абсталяваньне, і даваць заказчыкам дакладныя інфармацыі аб вытворчых магчымасьцях, саліднасьці розных машына-будаўнічых замежных фірм, а таксама забараніць гандлёвым прадстаўніцтвам мяняць, бяз ведама заказчыкаў, фірмы, тыпы абсталяваньня і інш.

15) Маючы на ўвазе, што ў адбываючымся сацыялістычным спаборніцтве па лініі прамысловасьці рэспублікі мала закранута самабудаўніцтва,-лічыць мэтазгодным для падняцьця актыўнасьці і заахвочваньня рабочых мас і тэхнічнага пэрсаналу, арганізаваць у бягучым годзе ўсебеларускі конкурс на лепшае будаўніцтва. Прапанаваць ВСНГ у адбываючымся конкурсе прадпрыёмстваў уключыць таксама 1 будаўнічы аб'ект.

16) Абавязаць усе будуючыя і будаўнічыя арганізацыі выконваць апублікаваныя ў Бюл. СНК БССР № 3 за 1929 г. правілы пра ўжываньне дэфіцытных матар'ялаў і замену іх недэфіцытнымі.

17) Прымаючы пад увагу ўсё яшчэ не- [illegible]

неабходныя для праэктаваньня і разьлікаў нормы і правілы, а таксама адпускныя цэны на будаўнічыя матар'ялы.

25) Прапанаваць ВСНГ неадкладна прыняць захады да распаўсюджваньня гэтай пастановы і даць адпаведныя дырэктывы да яе выкананьня.

Старшыня Эканамічнай Нарады пры Савеце Народных Камісараў БССР **Карклін**.

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР **Крывіцкі**.

12 ліпеня 1929 г.
г. Менск.

ХРОНІКА

ПАДПІСКА НА 3-Ю ПАЗЫКУ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ.

ВЫКЛІКАЮЦЬ УСЕ ГАЗЭТЫ.

Супрацоўнікі газэты „Чырвоная Зьмена“ падпісаліся на 3-ю пазыку ў разьмеры месячнага заработку і выклікаюць супрацоўнікаў усіх газэт і часопісаў.

СУПРАЦОЎНІКІ БАН ПАДПІСАЛІСЯ НА 14.000 РУБ.

Супрацоўнікі Бел. Акадэміі Навук падпісаліся на 3-ю пазыку індустрыялізацыі ў [illegible] разьмеры месячнага заработку, што складае каля 14.000 руб., і выклікаюць НДІ, НК Асьветы, С-Г Акадэмію і Вэтэрынарны Інстытут.

РАБОЧЫЯ ДРУКАРНІ БАН ПАДПІСАЛІСЯ НА 1420 РУБ.

У працягу ўчарашняга дню рабочыя друкарні БАН падпісаліся на 1420 руб. і выклікаюць рабочых інш. друкарняў.

КАЛГАС НА ПЛОШЧЫ 2000 ГЭКТ.

Замест 4-х калгасаў, якія павінны былі арганізавацца на Мар'інскіх балотах (на плошчы 2000 гэкт.) з дэмабілізаваных чырвонаармейцаў, калегія НКЗему прызнала мэтазгодным арганізаваць адзін буйны калгас на плошчы 2000 гэкт.

Вынікі працы настаўніцкіх курсаў.

Прэзыдыум Менскага акрвыканкому абгаварыў даклад інспэкцыі нарасьветы аб выніках працы 6-тыднёвых настаўніцкіх курсаў.

На курсах працавала 64 настаўнікі вясковых школ; большасьць настаўнікаў—з вялікім стажам.

Прэзыдыум акрвыканкому даў указаньне, каб настаўнікі-курсанты з набытымі ведамі азнаёмілі настаўніцтва на мясцох шляхам прапрацоўкі пытаньняў, якія праходзіліся на курсах, на раённых канфэрэнцыях і ў гуртках.

Акрфа і інспэкцыі нарасьветы запрапанавана прадугледзіць у бюджэце наступнага году водпуск сродкаў на забясьпечаньне вясковых школ сельска-гаспадарчай літаратурай, каб прыдаць школам с.-г. ухіл.

Райвыканкомам дадзена ўказаньне шырэй уцягнуць настаўніцтва ў правядзеньне аграпрапаганды сярод сялянства.

Перад НКА ставіцца пытаньне аб прыстасаваньні праграм вясковых пачатковых школ для наданьня апошнім сельска-гаспадарчага ўхілу.

Загатоўка садавіны і гародніны на экспарт.

Сёлета Ўправа Дзяржгандлю БССР упяршыню вядзе кансэрвіроўку трускавак, на якія вялікі попыт на ангельскім рынку. Сёлета будзе экспартавана за межы да 3000 пудоў кансэрваваных трускавак.

У мінулым годзе было вывезена за межы каля 400 тон брусьніц. Сёлета мяркуецца вывезьці кала 1000 тон. Падрыхтоўчая праца да зьбіраньня і сартыроўкі брусьніц ужо праведзена.

У мінулым годзе было экспартавана звыш 1000 тон цыбулі. Сёлета мяркуецца гэту колькасьць падвоіць. Дзеля гэтага з Белсельсаюзам заключана кантрактацыя на засеў цыбуляй 75 гэктараў.

Летась экспартавана 1750 тон яблык. Яблыкі ішлі, галоўным чынам, на нямецкі рынак. Сёлета мяркуецца экспартаваць каля 5000 тон. 3000 тон яблык будзе дастаўлена Дзяржгандбелу Белсельсаюзам згодна заключанай умовы, а 2000 тон будзе загатоўлена раёнамі.

Да пабудовы помніка Леніну.

Помнік У. І. Леніну будзе будавацца на Пляцу Волі на месцы помніка Лекерту. Сквэр будзе пераабсталяваны; усе вялікія дрэвы будуць высечаны, каб помнік было відаць здалёку. Помнік Лекерту будзе перанесен на Юбілейны пляц.

12 жніўня—Усебеларускі зьлёт піанэраў.

Зараз ва ўсіх раёнах і акругах адбываюцца зьлёты піанэраў, якія працягнуцца да 12-га жніўня. Усебеларускі зьлёт піанэраў адбудзецца 12 жніўня, а ўсесаюзны—17 жніўня.

Падрыхтоўка вылучэнцаў.

По вестках культаддзелу ЦСПСБ, у Полацку і Віцебску працуюць курсы па падрыхтоўцы вылучэнцаў для практычнай работы ў савецкім апараце. На абодвых курсах навучаецца 58 вылучэнцаў, з якіх 22 жанчыны.

* * *

З 1-га верасьня ў Менску адчыняюцца двухмесячныя курсы для перападрыхтоўкі вылучэнцаў, якія працуюць у Нар. Кам. Земляробства і ў мясцовых зямельных органах.

Вымова Гомельскаму АкрЗА.

За дрэннае правядзеньне вясеньняй сяўбы і слабую падрыхтоўку да асеньняй пасеўнай кампаніі, Калегія Нар. Кам. Земляробства абвясьціла вымову ўсяму складу Гомельскага Акругавага Зямельнага Аддзелу і запрапанавала прыняць усе меры да пасьпяховага правядзеньня асеньняй сяўбы.

325.000 руб.—на ўгнаеньне да асеньняй сяўбы.

На набыцьцё штучнага ўгнаеньня да асеньняй сяўбы сельска-гаспадарчай капэрацыі адпушчан крэдыт у суме 325 тысяч руб.

Арганізацыя мэліарацыйнага саюзу.

Узьнята хадайніцтва перад урадавымі органамі аб арганізацыі ў БССР самастойнага мэліарацыйнага саюзу, які будзе больш пасьпяхова займацца пытаньнямі мэліарацыі.

2165000 руб. на камунальнае будаўніцтва.

На камунальнае будаўніцтва ў 4 квартале 1928-29 г. Дзяржплян вызначыў 2165000 руб., з іх: на жыльлёвае будаўніцтва—1462000 руб., на электрыфікацыю—558000 руб. і на мясцовую прамысловасьць—145000 руб.

Эпізоотолёгічнае аддзяленьне.

Прымаючы пад увагу вялікую патрэбу ў вывучэньні эпізоотыі ў умовах БССР, Дзяржплян прызнаў мэтазгодным з 1 кастрычніка г. г. адчыніць пры Віцебскім вэтэрынарна-бактэрыялёгічным інстытуце эпізоотолёгічнае аддзяленьне.

Усебеларуская канфэрэнцыя прыхільнікаў кіно.

ЦП саюзу працмастацтва пастанавіла арганізаваць бюро т-ва прыхільнікаў савецкага кіно. Бюро даручана правесьці падрыхтоўчую працу да ўсебеларускай канфэрэнцыі прыхільнікаў савецкага кіно, якая мае адбыцца ў бліжэйшым часе.

АД ЦКК КП(б)Б.

У панядзелак, 22-VII, а 6-й з пал. гадз. вечара адбудзецца пасяджэньне тройкі ЦКК КП(б)Б (Менск, Савецкая 55, 3-ці паверх, пакой № 18), дзе будуць разглядацца справы наступных т. т.:

ЛОСЬ Грыгоры Ал—віч.—Бабруйская арганізацыі, ЗЕБЕНЯКА Пётра А—віч.—Бабр. арганіз., ВЕРЖБІЦКІ Мацьвей Грыгораў.—Аршанская арганізацыі, ЖЫНСКІ Базыль Базылёў—Магілеўская арганіз., НІКІЦІН Анатолі Яўхімавіч—Вышэйшая леўская арганіз., ШАТЭРНІК Яўхім Герасімаў—Менская арганіз. Выш... таварышы павінны зьявіцца на вызначаны час. Праезд за свой кошт.

Падрыхтоўка да Усебеларускай Спартакіяды вясковых фізкультурнікаў

(*Гутарка з намесьнікам старшыні ВСФК Бел. т. Л...*)

Паводле вестак ВСФК Бел., ва ўсіх акругах ідзе ўзмоцнённая падрыхтоўка да Усебеларускай Спартакіяды вясковых фізкультурнікаў. Ужо зараз у цэлым шэрагу раёнаў праведзены раённыя спартакіяды, а з 1 жніўна пачнуцца акруговыя спартакіяды. У кожнай акрузе ў спартакіядах будзе ўдзельнічаць каля 200 чалавек вясковых фізкультунікаў.

Усебеларуская Спаракіяда пачнецца 18 жніўня; 18 жніўня будзе арганізавана дэманстрацыя менскіх фізкультурнікаў суполчна з удзельнікамі Спартакіяды. на якую з усіх акруг прыедзе да 225 фізкультурнікаў. Спаборніцтвы на Спартакіядзе пачнуцца 19 жніўня.

ВСФК Бел. мяркуе арганізаваць цэлы шэраг індывідуальных і калектыўных спаборніцтваў—сустрэч па розных відах спорту паміж асобнымі камандамі і фізкультурнікамі акруг. Гэта будзе зроблена з мэтай паказаць вясковым фізкультурнікам дасягненьні і спартыўную тэхніку гарадзкіх фізкультурнікаў.

Для ўдзельнікаў Спартакіяды будзе арганізавана шэраг экскурсій на фабрыкі і заводы Менску. На стадыёнах будуць абсталёваны фізкультурныя выстаўкі і паказаньчыя антрапамэтрычныя габінэты, у якіх будзе весьціся навукова-дасьледчая праца.

Папулярызацыя фізкультуры і надыходзячай Усебеларускай Спартакіяды, а таксама дапамога вяскавым фізкультурнікам у падрыхтоўцы [...] дзеньня раённых спартакіяд [...] дзіцца і гарадзкімі фізкульт[...] шляхам выездаў у вёскі і [...] няў. Усебеларускі вэлёпрабег [...] задачай ставіць таксама [...] практычнай дапамогі і прыцягненьня грамадзкай думкі да Спартакіяды. Дзеля гэтага ўдзельнікі [...] будуць спыняцца ў вёсках і [...] дзіць гутаркі з сялянствам, а [...] весьці спэцыяльную падрыхтоўку вясковых фізкультурнікаў.

У цэлым шэрагу месц [...] маем такае становішча, што [...] акіяды вясковых фізкультурнікаў [...] дыходзяць, як да звычайнага [...] ніцтва, а не як да мэтаду [...] ахопу працоўных вёскі фізкуль[...]. Ёсьць выпадкі, што райсаветы фізкуль[...]туры займаюцца спэцыяльным [...] людзей, якія маюць добрыя [...] ні ў галіне спорту, і праходзяць [...] іх сацыяльнага твару.

ВСФК Бел. ня раз завостраў [...] і зараз патрабуе ад саветаў [...] туры падрыхтоўваць і пр[...] Спартакіяды, такім чынам, [...] спрыялі пашырэньню гуртоў [...] турнікаў у вёсцы і адбівалі [...] ні батрацка-бядняцка-серадняцкі[...]. Саветам фізкультуры неабходна [...] ліва даскана адносіцца да [...] ўдзельнікаў на акругавыя і [...] рускую Спартакіяду з тым, [...] сава-варожыя і чыжыя элементы [...] папалі на гэтыя сьвяты фізкультуры.

НОВЫЯ КНІГІ.

Паступілі ў рэдакцыю газэты „Савецкая Беларусь“ для рэцэнзіі наступныя кнігі выданьня Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва.

1. „Кароткі нарыс гісторыі КП(б)Б“. Ю. Майзэль, М. Шапавалаў. Стар. 160, цана 90 кап. Гістпарт ЦК КП(б)Б.
2. „Чароўная іголка“. Левін. Фэльетоны. Стар. 119, цана 55 кап.
3. „Аленка“. Матвіенка. Дзіцячая п'еса ў 3-х дзеях. Пераклад з украінскай мовы. Стар. 40, цана 20 кап.
4. „Контрасты“. С. Пілітовіч. Стар. [...], цана 45 кап.

СПРАВАЧНЫ АДДЗЕЛ.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК НА 18-га ЛІПЕНЯ 1929 г.

	Куп.	Прад.
1-я 6 проц. залат. выйгр. паз.	4.80,5	—
2-я 6 проц. выйгр. паз.	—	—
Бяспроц. выйгр. пазыка 1926 г.	126.75	128.75
10 проц. дзярж. пазыка 1927 г.	26.31	26.41
6 проц. дзярж. выйгрыш. пазыка індустр.	25.63	25.73
3-я сялянск. выйгр. паз. 27г.	5.03,5	—
12 проц. дзярж. унутр. 1927 г.	101.56	—
Дзярж. паз. узм. сял. гасп.	10.55	10.60
2-я 6 проц. выйгр. паз.	26.82,5	26.92,5
Пазыка індустр.	26.06,5	26.16,5
11 проц. дзярж. унутр. пазыка 1928 г.	104.16	104.21
Пазыка 1929 г.	100.38	100.78

Апавяшчэньні.

Ад камісіі па чыстцы АКРЗА.

У панядзелак, 22 ліпеня, роўна ў [...] гадзіне ўвечары ў залі спэцыялістаў Доме Селяніна пачнецца чыстка апарату АКРЗА. Яўка ўсіх супрацоўнікаў [...] абавязкова. Запрашаюцца прыняць удзел рабочыя прадпрыёмстваў, дэпутаты савету, працаўнікі АВК, яго аддзелаў шых акруговых устаноў, сяляне, а [...] ўсе члены брыгады і камісій, якія [...] ралі асабовы склад і працу АКРЗА.

— У сувязі з незаканчэньнем чысткі апарату Акруговага Суду чыстка апарату НКЮ пераносіцца на 22-га ліпеня 1929 г. (панядзелак) і адбудзецца ў памяшканьні Дому Селяніна а 6-й гадзіне ўвечары.

Запрашаюцца ўсе працоўныя г. Менску дзеля прыняцьця ўдзелу ў [...] па чыстцы апарату НКЮ.

Часова вык. абавязкі адказнага рэдактара П. ШАСТАКОЎ.

ЗАКЛЮЧНЫ БАЛЯНС

БЫХАЎСКАГА КАМБІНАТУ (МАГІЛЕЎСКАИ АКРУГІ)

на 1-е кастрычніка 1928 году.

АКТЫЎ

I. Маемасьць.		
1. Будынкі і пабудовы:		
а) Будынкі вытвор., падсоб. і гандл. прызн.	8303—41	
б) жыл. будынкі і службы	441—32	
		8744—63
2. Абсталяваньне і машыны:		
а) Сілавыя ўстаноўкі	8130—	
б) Тэхн. абстал. і машыны	3205—	
		11335—
3. Інструманты		60—71
4. Гаспад. інвэнтар:		1020—62
II. Запасн. абсталяв		23584—66
III. Нясконч. пабудовы		18613—50
IV. Матар'ялы:		
1. Апал	245—52	
2. Дапаможн. матар'ялы	224—30	
3. Рам. будаўн. матар'ялы	6574—49	
		7044—31
V. Тавары і гандл. вырабы:		
Тавары і гандл. вырабы на складах.		682—95
VI. Грашовыя сродкі:		
Каса (наяўнасьць грошай, чэкі, паступіўшыя пераводы, маркі і г. д.).		989—55
VII. Паі і акцыі. (Інш. прад.)		200 —
VIII. Вэксалі і дакум. да атрым.		
Вэксалі пратэставаныя		2000 —
IX. Падсправаздачн. сумы.		135—57
X. Дэбіторы.		
Дастаўшчыкі і падрадчыкі	6135—82	
Пакупнікі і заказчыкі.	2114—23	
Няпэўныя даўжнікі	2845—02	
		11095—07
XI. Выдаткі будуч. году.		
Капіт. выдаткі будуюч. маем.		2242—76
XII. Вынікі.		
Страты справ. году		15870—26
БАЛЯНС		103619—59

ПАСЫЎ

I. Капіталы:		
Статутны	37162—[...]	
Амартызацыйны (запасны)	1295—[...]	
	172—[...]	
		39231—[...]
II. Фонды:		
Фонд дабрабыту раб. і служ.		172—[...]
III. Рэзэрвы:		
Рэзэрвы няпэўных даўгоў		4345—[...]
IV. Доўгатэрм. крэдыты:		
Ссуды в Сельгаспадбанку	1700[...]	
» Белкамунбанку	5805—[...]	
» Прамфонду	33000[...]	
		40505—[...]
V. Вэксалі выдадзеныя		8313—[...]
VI. Крэдыторы.		
Дастаўшчыкі і падрадчыкі	821—[...]	
Страхкаса і саюз	3763—[...]	
Неаплачан. падаткі і зборы і абавязк. узносы ў прамфонды і мясц. бюджэт	1021—[...]	
Крэдыторы розныя	5441—[...]	
		11050—[...]
БАЛЯНС		103619—[...]

ЗАБАЛЯНСАВЫЯ АРТЫКУЛЫ

Вэксалі атрымац. па гарантыях	27674—68	Выдадзеныя гарантыйныя вэксалі	27674—[...]

РАХУНАК ПРЫБЫТКАЎ І СТРАТ за 1927-28 апэрац. год.

ДЭБЕТ

Ад вытворчасьці па прадпрыёмств.	7335—79
Гандлёвыя выдаткі	711—02
Агульна-адміністрац. выдаткі	4108—01
Проц. заплачан.	87—63
Адліч. у рэзэрв няпэўных даўгоў і пратэстав. вэксал.	4345—02
Дадатков. (40 проц.) амартыз. маем. па млыну	287 —
Выпадковыя страты	203—96
БАЛЯНС	17078—43

КРЭДЫТ

Проц. атрыманыя	12—[...]
Выпадковыя прыб.	750—[...]
Пераліч. з рахунк. асн. капіт. амартыз. па Ташчыцк. заводу з прычыны яго перадач	445—[...]
Усяго	1208—[...]
Чыстыя страты	15870—[...]
БАЛЯНС	17078—[...]

Заг. Камбінату ЗЕМЦАЎ.

Бугальтар ПАДАБЕД.

Гэты баланс і рахунак прыбыткаў і страт зацьверджаны асталай камісіяй пры Магілеўскім акрфінаддзеле 16-IV—29 г. (пратак. № 6) і прэзыдыумам АВК 20-V—29 г. (прат. № 1) і друкаваць дазваляецца.

Магілеўскі Акрфаінспэктар БАРОЎСКІ.

ТЭАТР—КІНО

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР.
АДЧЫНЕНЬНЕ ГАСТРОЛЯЎ МУЗЫЧНАЙ КАМЭДЫІ
чацвер, 18 ліпеня
„РОЗ-МАРИ“ у 3-х дзеях і 9 карц.
ПАЧАТАК А 9-Й ГАДЗІНЕ.

КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА“,
АД АЎТОРКА, 16 ЛІПЕНЯ
мастацкі баявік
„МАТРОС ГАЛАЙ“ у 6 частк.
Пач. сэансу роўна а 8 гадз. Каса адчынена ад 6 гадз.

КІНО-САД «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА» Савецкая № 71,
1) Тры пакоі з кухняю
2) Па Конго
Пачатак—9 г. 15 хв. і 10 г. 45 хв.
Каса а 7 гадзіне.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ»,
З аўторка 16 ліпеня
Новы фільм вытворчасьці «ВУКФУ»
„Млын на ўзьлесьсе“.
Драма ў 6 частках

КІНО ПРАЛЕТАРЫ
1) Лялька з мільёнамі
2) Марак
Пачатак сэансаў 7 г. 15 хв.
Каса адчынена а 6 гадз.

ЦЫРК

СЁНЬНЯ—
ВЫКЛЮЧНАЯ Ў СЭЗОНЕ ПРАГРАМА
З УДЗЕЛАМ
нова прыбыўшых гастралёраў
З прычыны грандыёзнай праграмы пач. роўна а 9 г. увеч.
ПА ЗАЯЎКАХ ФАБКОМАЎ І МЯСЦКОМАЎ — СКІДКА.

ЗГУБЛЕНЫ.

Вучотна-конская карт. Рабцева С. П., выд. Мсьціслаўскам РВК, кв. 426 п.

Конская карт. Серафімовіча М. А., выд. Барысаўск. ваенкаматам, кв. 427 п.

Асабовае пасьведчаньне Стальмаховіча Т. Т., выд. Горэцк. с-гасп. акадэм. кв. 428 п.

Пасьведчаньне аб эдукац. за № 469 Савініча В. М., кв. 428 п.

Закрэп. талён 2-й пазыкі індустр. сер. 25 № 026859, № 026860, сер. 23 № 006514, 0065 13сер. 19 № 066296 на імя Малеца М. В., кв. 428 п.

Сяброўскі білет Гітліца В. Я., выд. саюзам працасьветы, кв. 428 п.

Вайсковая кніжка запаснага Казлова А. А., выд. 192 тэр. палком 7 роты, кв. 428 п.

Конская карт. Казловай Е. С., выд. Горацкім РВК, 428 п.

Асабовае пасьведчаньне № 407 Цітава П. А., выд. Горац. акад. кв. 428 п.

Галоўлітбел 595.

Менск, дзяржаўная друкарня